## «КОЖНЫ ЧАЛАВЕК — ЗАГАДКА, І РАЗГАДАЦЬ ЯЕ АДРАЗУ НЯЛЁГКА»

Канец 60 — пачатак 70-х гадоў мінулага стагоддзя быў часам прыкметных зрухаў да лепшага ў жыцці насельніцтва СССР. Дынамічна развівалася эканоміка: асвойваліся раней недаступныя радовішчы карысных выкапняў, будаваліся новыя заводы і фабрыкі, электрастанцыі. Распачыналася будаўніцтва знакамітай Байкала-Амурскай магістралі. Выраставалі новыя гарады і пасёлкі, пашыраліся і змянялі сваё аблічча старыя. Пакрысе багацела і добраўпарадкоўвалася вёска. Прыкметна павысіўся ўзровень матэрыяльнага дабрабыту насельніцтва. Краіна ўпэўнена, як пісалася ў газетах, крочыла да камунізму, праграма пабудовы якога была прынятая ў 1961 годзе на XXII з'ездзе КПСС.

Як гаварылася ў гэтай праграме, камунізм — гэта бяскласавае грамадства «з адзінай агульнанароднай уласнасцю на сродкі вытворчасці, поўнай сацыяльнай роўнасцю ўсіх членаў грамадства, дзе разам з усебаковым развіццём людзей вырастуць і вытворчыя сілы на аснове навукі і тэхнікі, якія пастаянна развіваюцца, усе крыніцы грамадскага багацця пальюцца поўнай плынню і здзейсніцца вялікі прынцып "ад кожнага — па здольнасцях, кожнаму — па патрэбах"»[1].

Задавальненне ўсё ўзрастаючых патрэб людзей, як вядома, немагчымае без развіцця вытворчасці. А яно вымагала прыцягнення вялікіх людскіх і фінансавых рэсурсаў. З рэсурсамі людскімі было крыху прасцей — на шматлікіх камсамольскіх будоўлях працавала пераважна моладзь, і не толькі гарадская, але і сельская. Бо да таго часу ў калгасах істотна павысіўся ўзровень механізацыі сельскагаспадарчых прац, што рэзка знізіла патрэбу ў рабочых руках. Мноства

[1] Цыт. паводле: Программа КПСС.— М., 1977.— С. 62.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

юнакоў і дзяўчат падаліся з вёсак у гарады, на новабудоўлі ў далёкія і часам неабжытыя яшчэ мясціны, каб уласнымі рукамі будаваць новыя гарады, а разам з тым — сваю і агульную светлую будучыню.

Куды больш складана было з рэсурсамі фінансавымі. Бюджэт краіны, хоць і немаленькі, усё ж меў нейкую мяжу. А масавая міграцыя насельніцтва, асабліва моладзі, рэзка абвастрыла многія праблемы. І асабліва, бадай, і без таго няпростае «кватэрнае пытанне». Бо там, дзе моладзь — там і каханне, узнікненне новых сем'яў, нараджэнне дзяцей. А з імі ў палатцы, часовым бараку ці «ў кутку» наёмнай кватэры жыць, мякка кажучы, няпроста.

Пераважная большасць жылля ў СССР, як вядома, выдзялялася бясплатна, кааператыўнае будаўніцтва было развіта значна менш. У поўнай меры забяспечыць нармальныя бытавыя ўмовы для навасёлаў і такім чынам замацаваць кадры, а адначасова весці будаўніцтва прамысловых аб'ектаў дзяржаве было не пад сілу. Гэта вымушала эканоміць, будаваць кватэры з разліку 6 квадратных метраў на чалавека. Эканомілі і на будоўлі прадпрыемстваў, вельмі часта размяшчаючы іх нават у жылых мікрараёнах, каб выйграць на пракладцы рознага роду камунікацый. І мясцовыя ўлады з гэтым пагаджаліся, бо будоўля буйнога прамысловага аб'екта — гэта развіццё горада: рабочыя месцы, грошы ў бюджэт, жыллё, школы, дзіцячыя сады, установы культуры. Пры гэтым не надта зважалі на шкоду, якую прыносяць выкіды гэтых прадпрыемстваў навакольнаму асяроддзю і здароўю людзей. Нават ачышчальныя збудаванні нярэдка рабілі па «ўсечаным» варыянце. Лозунг «Усё на карысць чалавеку, усё дзеля чалавека» на практыцы набываў такім чынам даволі двухсэнсоўнае значэнне.

Апроч таго, у праграме КПСС абвяшчалася, што ў працэсе пабудовы камуністычнага грамадства адбудуцца карэнныя змены не толькі ва ўзроўні матэрыяльнага дабрабыту, але і ў псіхалогіі чалавека. Лічылася, што ён паступова пазбавіцца такіх «радзімых плямаў капіталізму», як індывідуалізм, сквапнасць, стане высокамаральным чалавекам, першай патрэбай якога будзе праца на карысць грамадства.

Аднак, бадай, усялякая сацыяльная тэорыя — гэта свайго роду схема, у якую рэальнае жыццё цалкам не ўкладваецца. Бо кожная з'ява, у тым ліку і сам чалавек, унутрана супярэчлівая. І хоць заўсёды падкрэслівалася, што для марксісцка-ленінскага вучэння характэрны дыялектычны падыход да аналізу рэчаіснасці, на практыцы гэта было не зусім так. Зыходным пунктам у праграме пабудовы камунізму быў, па сутнасці, тэзіс «быццё вызначае свядомасць». Але ж і свядомасць чалавека не ў меншай ступені вызначае быццё і яго самога, і грамадства



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ў цэлым. І змяняецца гэтая свядомасць куды павольней і цяжэй, чым тое ж быццё.

Партыя і ўрад, вядома, прыкладалі нямала намаганняў, каб перамяніць натуру чалавека. Праводзілася вялікая ідэалагічная і выхаваўчая праца. Прапагандаваўся прынцып калектывізму, асуджалася мяшчанства, якое разумелася як перавага асабістых інтарэсаў над грамадскімі, і найперш — імкненне да ўзбагачэння. Таму, напрыклад, забаранялася працаваць больш, чым у адной арганізацыі, дачныя ўчасткі не павінны былі перавышаць 6 сотак, і на іх можна было мець домік не больш за 36 метраў агульнай плошчы, прычым не капітальнай пабудовы.

Партыйныя органы ўсіх узроўняў рабілі ўсё, каб людзі і на працы, і ў сям'і, і ў побыце кіраваліся нормамі маральнага кодэкса будаўніка камунізму, у якім абвяшчалася, што чалавек чалавеку сябра, таварыш і брат (што, вядома, не адносілася да капіталістаў і іншых прыгнятальнікаў працоўных). Асабліва гэта тычылася членаў партыі, якія павінны былі ва ўсім паказваць прыклад. Цяпер можа здацца дзіўным, што, напрыклад, развод разглядаўся як найсур'ёзнейшае парушэнне партыйнай дысцыпліны, за якое ў найлепшым выпадку выносілі вымову з запісам ва ўліковую картку, а то і зусім выключалі з партыі. Апошняе ж па тых часах для многіх азначала аўтаматычны крах кар'еры, звальненне з працы. Урэшце, і беспартыйнага за нейкія сур'ёзныя парушэнні маральнага кодэкса будаўніка камунізму маглі тым ці іншым чынам пакараць.

Варта адзначыць, што ні сама ідэя пабудовы камунізму, ні маральны кодэкс яго будаўніка не пярэчылі спрадвечным ідэалам і маралі народа. І па меры росту дабрабыту маральны клімат у грамадстве паляпшаўся. Аднак у той жа час выяўляліся і іншыя тэндэнцыі. Чалавек заўсёды імкнецца нейкім чынам выявіць сваю непаўторнасць, індывідуальнасць, у тым ліку і праз адзенне, рэчы і г. д. А паколькі ў часы масавай вытворчасці магчымасцей для таго было няшмат, ды далёка не ўсё можна было набыць у крамах, расквітнеў блат. Побач з тым пашыралася і псіхалогія спажывецтва, ніяк не перавыхоўвалася тое ж мяшчанства, якое ўмела маскіравала свае інтарэсы гучнай рыторыкай. Як адзначае Сасноўскі, адзін з герояў рамана, «за сорак гадоў працы ў камсамоле, у саветах, у партыйных органах я не помню ніводнага выпадку, каб нехта прыйшоў і сказаў: «Я хачу вырваць у дзяржавы большы і смачнейшы кавалак». Усе пачынаюць з такіх матываў, з такой філасофіі, што слухаеш разявіўшы рот і ахаеш».

Гэтыя рэаліі тагачаснага жыцця і павінны былі адбіцца ў задуманым І. Шамякіным рамане. Аднак акрэсліць у найбольш агульных рысах тэматыку і праблематыку будучага твора — гэта толькі пачатак

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

справы. Стварэнне праўдзівага мастацкага палатна пра жыццё народа ў пэўную эпоху вымагала ад пісьменніка не толькі глыбокага асэнсавання яе супярэчнасцей і тэндэнцый. Не менш важна было і «сканструяваць» вобразную сістэму твора, якая дазволіла б адлюстраваць жыццё грамадства ва ўсёй яго паўнаце і шматграннасці, пераканаўча матываваць сувязі паміж шматлікімі персанажамі — прадстаўнікамі самых розных чалавечых і сацыяльных тыпаў. Бо менавіта праз раскрыццё іх вобразаў і выяўляецца асноўная ідэя твора. Іншымі словамі кажучы, неабходна распрацаваць яго сюжэт, фабулу, прадумаць кампазіцыю. Далёка не заўсёды ўдаецца хутка знайсці аптымальнае вырашэнне гэтых праблем.

Спачатку, як адзначаў сам І. Шамякін, у яго свядомасці акрэсліўся вобраз цэнтральнага героя будучага рамана. Яго прататыпам стаў сябра пісьменніка, вядомы беларускі драматург Андрэй Макаёнак, чалавек адметны па сваёй натуры. Аднак сюжэт твора склаўся не адразу. Для таго, у прыватнасці, вельмі важна было ўдала вызначыць прафесію і пасаду героя. Трэба было, каб яны давалі магчымасць, па-першае, пераканаўча матываваць цесныя ўзаемадачыненні героя з вялікай колькасцю тыповых прадстаўнікоў самых розных сацыяльных пластоў — ад шараговых грамадзян да вышэйшых эшалонаў улады. Гэта дазволіла б звязаць сюжэтныя лініі будучага рамана і намацаць тыя болевыя кропкі ў жыцці грамадства, якія стануць прадметам мастацкага аналізу ў творы. А разам з тым — і выявіць уласныя адносіны да вострых праблем сучаснасці праз раскрыццё характараў персанажаў і цэнтральнага героя твора.

Задача, як бачым, не такая і простая. Вырашыць яе дапамог выпадак. Думка зрабіць свайго героя галоўным архітэктарам абласнога горада з’явілася ў пісьменніка на пасяджэнні Бюро ЦК КПБ, на якім абмяркоўвалі забудову Паркавай магістралі ў Мінску[1]. І. Шамякін, як відаць, ацаніў маштаб магчымасцей, якія дае менавіта такі сацыяльны статус героя для ўвасаблення задумы будучага твора аб сучаснасці. Нехапала, праўда, ведання спецыфічных архітэктурных праблем. А без таго цяжка было рэалістычна паказаць і працу героя твора і яго калег, і «вузкія месцы» ў тагачасным горадабудаўніцтве. І мастак слова сур’ёзна ўзяўся за вывучэнне гэтай сферы чалавечай дзейнасці[2].

---

[1] Гл.: Шамякін, І. Начныя ўспаміны // Шамякін І. Збор твораў. [У 8 т.].— Т. 4.— Мінск, 2007.— С. 473; Шамякін, І. Роздум на апошнім перагоне: Дзённікі 1900—1995 гадоў.— Мінск, 1998.— С. 295.

[2] Гл.: Шамякін, І. Роздум на апошнім перагоне…— С. 295; Шамякіна, Т. Архітэктура ў жыцці і творчасці Івана Шамякіна // Роднае слова.— 2004.— № 1.— С. 65.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Вядома, праблематыка рамана бачылася пісьменніку куды шырэйшай, чым жыццё і праца архітэктараў. Галоўным прадметам мастацкага даследавання павінны быў стаць ўзровень маральнасці тагачаснага грамадства, які перш за ўсё і вызначае галоўныя тэндэнцыі яго далейшага развіцця. Таму праблемам метадаў партыйнага кіраўніцтва, побыту, сям'і, дружбы, узаемаадносін бацькоў і дзяцей увага ў рамане надаецца не меншая, чым вытворчым. Дый самі чыста, здавалася б, вытворчыя і службовыя канфлікты, якія ў «Атлантах і карыятыдах» вылучаюцца на першы план, асэнсоўваюцца найперш з пункту гледжання выяўлення чалавечай сутнасці іх удзельнікаў.

Асаблівасці тэматыкі і праблематыкі, прафесійная прыналежнасць і сацыяльны статус галоўнага героя заканамерна абумоўлівалі як складанасць ідэйна-вобразнай структуры, сістэмы вобразаў рамана, так і значнасць часавых і прасторавых межаў падзей у ім. Як галоўны архітэктар абласнога горада Карнач па родзе сваёй дзейнасці звязаны з кіраўнікамі і работнікамі самых розных арганізацый і ўстаноў. Гэта, бадай, найперш прадстаўнікі гарадскіх і абласных савецкіх і партыйных органаў улады — старшыня гарвыканкама Кіслюк, першы сакратар гаркама партыі Ігнатовіч, першы сакратар абкама партыі Сасноўскі, іх падначаленыя (начальнік архітэктурна-будаўнічага ўпраўлення аблвыканкама Галубовіч, загадчык аддзела гаркама партыі Языкевіч і іншыя). Гэта і адказныя работнікі Савета Міністраў (Крышталёў), Міністэрства будаўніцтва (Платкоў і іншыя), і кіраўнік гарадскога будтрэста Алейнік, дырэктар дрэваапрацоўчага камбіната Аўсянікаў, загадчык камунальнага аддзела Анох. Гэта і калегі, якія працуюць як у непасрэдна падначаленых Карначу архітэктурных майстэрнях (Макаед, Шугачоў), так і ў іншых гарадах. Як выкладчык інстытута Максім Карнач мае непасрэдныя стасункі з калектывам кафедры і яе загадчыкам Нінай Макаед, студэнтамі. Апроч таго, галоўны герой рамана — муж і бацька, у яго ёсць іншыя родзічы. Ёсць і сябры: найперш таленавіты архітэктар Віктар Шугачоў і яго жонка. Дый з Ігнатовічам, мужам роднай сястры сваёй жонкі, у Максіма Карнача адносіны складваюцца таксама даволі сяброўскія. Нарэшце, гэта сакратарка Ігнатовіча Галіна Уладзіміраўна, адносіны якой з Карначом перараслі з узаемнай цікаўнасці ў нешта значна большае.

Удалае вызначэнне прафесіі і пасады галоўнага героя «Атлантаў і карыятыдаў» давалі магчымасць І. Шамякіну максімальна пашырыць ахоп рэчаіснасці за кошт увядзення вялікай колькасці персанажаў. І разам з тым — «зладзіць» сюжэт, жыццёва пераканаўча матываваць перасячэнне іх жыццёвых шляхоў або выключна службовымі, або таксама і сямейнымі, роднаснымі, сяброўскімі ўзаемадачыненнямі.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Заўважым, што хоць раман «Атланты і карыятыды» густа заселены персанажамі, але не перанаселены імі. Сярод іх няма «двайнікоў» — кожны з іх па сваёй чалавечай сутнасці нечым адрозніваецца ад іншага. Іначай кажучы, уяўляе з сябе адметны сацыяльны і чалавечы тып. Гэта — як асобны штрых, сукупнасць якіх пад рукой мастака слова паволі складае праўдзівую карціну жыцця сучаснага яму грамадства. Штрыхі гэтыя бываюць драбнейшымі і буйнейшымі, але самы, на першы погляд, нязначны з іх робіць гэтую карціну больш поўнай, выразнай і багатай на адценні.

Усяго ў адным эпізодзе з’яўляецца ўрач Вера Іванаўна, якая прыязджае да хворай маці Карнача. Аднак як яскрава выяўляюцца рысы яе характару, рэаліі жыцця тагачаснай вёскі. Напачатку ўрач не спадабалася Карначу: «Высокая, хударлявая, з грубаватымі мужчынскімі рысамі твару, які не асвятляўся ні дзявочай усмешкай, ні жаночай дабратой. Што салдат у белым халаце». Але, прыгледзеўшыся, убачыў у ёй і адданасць прафесіі, і шчыры клопат пра хворую, і добрую зайздрасць да больш вопытнага і таленавітага калегі, да якога яна і раіць звярнуцца Карначу, не надта зважаючы на ўласнае самалюбства.

Але значна больш увагі пісьменнік аддае персанажам, якія, на яго думку, з’яўляюцца выразнікамі вядучых тэндэнцый у жыцці грамадства. Найперш гэта, вядома, галоўны герой рамана Максім Карнач, вобраз якога, можна сказаць, стрыжнявы ў вобразнай сістэме і сюжэце твора, а разам з тым — і яго найважнейшы кампазіцыйны цэнтр. Такая яго роля абумоўліваецца, на наш погляд, перш за ўсё сутнасцю і маштабам асобы Карнача як чалавека і прафесіянала.

Карнач — чалавек разумны і сумленны, які мае немалы жыццёвы вопыт, добра зведаў людзей, імкнецца да іх аб’ектыўнай ацэнкі, але «…гэта не заўсёды ўдаецца. І таму, што сам ён — проста чалавек, і таму, што вакол — таксама чалавекі, самыя розныя, і ўзаемадзеянне паміж імі ў працэсе вытворчасці ніколі не выражаецца простым ураўненнем, формула адносін з людзьмі заўсёды складаная — як у вышэйшай матэматыцы». Не перабольшвае галоўны архітэктар і вартасцей сваёй асобы. Ён таксама можа часам памыляцца, дзейнічаць пад уплывам настрою, імпульсіўна. Але разам з тым Карнач вылучаецца цэльнасцю характару і натуральнасцю паводзін.

Як чалавек самакрытычны, ведаючы ўласныя недахопы, і перш за ўсё свой «узрыўны» характар, Карнач навучыўся не звяртаць асаблівай увагі на дробныя недахопы іншых. За доўгія гады працы на сваёй пасадзе спасцігнуў ён і няпростую механіку бюракратычнай машыны, уведаў тыя «тайныя спружыны», «націскаючы» на якія



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

можна дамагчыся таго, што трэба для справы, у кабінетах высокіх начальнікаў. І нярэдка выкарыстоўвае гэтае веданне, але, падкрэслім, менавіта ў інтарэсах справы, а не асабістых. Бо Карнач, апроч усяго іншага, не проста таленавіты архітэктар, ён — творца, які творыць па законах прыгажосці і для якога гармонія і прыгажосць аднолькава важныя як у архітэктуры, так і ў людскіх узаемаадносінах. Гэта — бадай, вызначальная рыса яго натуры, якая ў роўнай ступені выяўляецца як у прафесійнай дзейнасці, так і ў перыпетыях сямейнага жыцця.

Карнач як творца ніколі не бывае задаволены вынікамі сваёй працы: «…ніколі падоўгу не любаваўся ніводным аб'ектам, збудаваным па яго праекце. Часцей незадаволены і сваёй працай і асабліва працай будаўнікоў, лаяўся, потым, захоплены новай задумай, хутка забываўся і праходзіў міма свайго тварэння абыякавы». Бо гэта ўжо пройдзены адрэзак шляху да дасканаласці ў той справе, якая з'яўляецца галоўнай у яго жыцці. А справа, сэнс дзейнасці як архітэктара для Карнача — гэта найперш зрабіць горад такім, каб ён быў як мага больш прыгожым, утульным і зручным для жыцця яго насельнікаў і праз многія гады. Таму такое вялікае значэнне надае Карнач перспектыўнаму планаванню забудовы горада. Таму так імкнецца пераадолець адвечную для творцаў супярэчнасць паміж задумай і даступнымі сродкамі яе здзяйснення. І ідзе на немалую рызыку, даручаючы свайму сябру і таленавітаму архітэктару Шугачову, загадчыку адной з падначаленых яму архітэктурных майстэрняў, распрацоўку праекта забудовы раёна горада не тыпавую, на якую адпушчаныя сродкі, а эксперыментальную, спадзеючыся «выбіць» у міністэрстве дадатковыя грошы на будаўніцтва з дапамогай свайго родзіча і сябра, першага сакратара гаркама партыі Ігнатовіча. І па той жа прычыне рашуча змагаецца супраць «пасадкі» хімічнага камбіната ў Белым Беразе, бо гэта прывядзе да знішчэння дубровы — упрыгожання і лёгкіх горада, да забруджання ракі і паветра.

Усё непрыгожае, дысгарманічнае ў жыцці выклікае ў Карнача вострае непрыманне і патрэбу змагацца, не зважаючы ні на што. Ці шмат знайшлося б у тую пару людзей, якія асмеліліся б, як галоўны герой рамана, у вочы папракнуць першага сакратара абкама партыі за незаконнае выдзяленне кватэры яго сыну? Пры яго прынцыповасці Карнач быў проста асуджаны на канфлікты і «…усё жыццё канфліктаваў. У інстытуце. На працы. Нават у арміі. З калегамі. Сябрамі. Начальствам. З жонкай. А на пасадзе галоўнага архітэктара — адразу з многімі арганізацыямі і людзьмі: з заказчыкамі і будаўнікамі, Дзяржбудам і Белдзяржпраектам, з кіраўніцтвам і аддзеламі выканкама, з камунальнікамі, гандлярамі, мастакамі, транспартнікамі.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Тыя, хто любіў горад і сваю справу, разумелі яго, падтрымлівалі, заставаліся сябрамі, дурні і прыстасаванцы крыўдзіліся за непрымірымасць і рабіліся ворагамі».

Непрыманне дысгармоніі, фальшу выяўляецца і ў канфлікце Карнача з яго жонкай Дашай, якая за гады іх сумеснага жыцця ператварылася ў закончаную эгаістку са спажывецкай псіхалогіяй. І хоць Максім не здымае з сябе за гэта віны і больш за тое, яшчэ кахае жонку, аднак прыходзіць да нялёгкага рашэння скасаваць з ёй шлюб.

Не заўважыў ён, дый наўрад ці мог заўважыць у свой час мяшчанскія памкненні сціплай дзяўчыны, якая зачаравала яго сваім харастом. Першыя гады сумеснага жыцця паміж імі былі лад і згода, а далей усё хутчэй і хутчэй пачало расці ўзаемнае адчужэнне. Пачалося са спрэчак аб тым, якое імя даць дачцэ, якая нарадзілася, як яе выхоўваць. Потым — рашэнне Дашы пазбавіцца ад цяжарнасці насуперак просьбам мужа, які быў перакананы, што такая аперацыя — злачынства. Ды, магчыма, як і большасць мужчын, ён марыў пра сына. Адчуўшы пасля гэтага выпадку адасобленасць мужа, Даша, відаць, вырашыла, што прычына таму — нейкая суперніца. Пачаліся сцэны рэўнасці, пагоня за ўборамі, патрабаванне ўвагі да сябе, скандалы, папрокі ў былых крыўдах.

А далей — болей. Упартае супраціўленне пераезду з Мінска на новае месца працы мужа. І як помста за ўсе свае крыўды — зацятае маўчанне, гульня ў ахвяру дэспата-мужа ў спалучэнні з бессаромным вымаганнем грошай і пагардай да ўсяго дарагога яму. Даходзіць да таго, што Даша нават не лічыць патрэбным самой паведаміць мужу ні пра тое, што іх дачка збіраецца выйсці замуж, ні пра хваробу яго маці.

Карнач пры яго характары не прымаў фальшу ў адносінах людзей. Таму, у адрозненне ад жонкі ён з прыхільнасцю ставіцца да сваіх сватоў Прабабкіных. І наадварот, занадта, на яго погляд, «правільны» іх сын, муж дачкі, выклікае ў Карнача падазрэнне ў прытворстве, «двайной» натуры. Такой, якая выявілася ў яго жонкі. Эгаізм Дашы, яе прытворства не мелі межаў, і гэта разбурыла іх сям'ю, каханне. Не дзіва, што Карнач звяртае ўвагу на сакратарку Ігнатовіча, удаву, якая прывабіла не толькі прыгажосцю, але і чалавечымі якасцямі.

Такі характар галоўнага героя, пастаўленага ў цэнтр апавядання, даваў магчымасць не толькі надзейна зніташаць сюжэт твора. Вобраз Карнача ў «Атлантах і карыятыдах» — тое «павелічальнае шкло», якое дазваляе ў дэталях убачыць рэальныя супярэчнасці жыцця грамадства, ацаніць маральны патэнцыял прадстаўленых у рамане тыповых персанажаў. Найперш — праз паказ успрымання рэчаіснасці самім Карначом. Але ж мера і характар яго ўзаемадзеяння з кожным



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

з персанажаў, а значыць, і ступень разумення іх чалавечай і сацыяльнай сутнасці, розныя. Выяўленне ж маральнага аблічча грамадства вымагала ад пісьменніка глыбокага раскрыцця духоўнага свету выразнікаў розных тэндэнцый у яго жыцці. Думаецца, перш за ўсё гэтая акалічнасць і вызначыла для І. Шамякіна неабходнасць вылучэння значнай колькасці самастойных сюжэтных ліній, а таксама перавагу ў рамане фабульнага дзеяння.

Так, адносна самастойнай з'яўляецца сюжэтная лінія ўзаемадачыненняў Віктара Шугачова, яго сям'і і Максіма Карнача. Шугачоў — калега, аднадумца і даўні сябра Карнача. Гэта архітэктар, які, на думку Карнача, «…не горшы за яго, можа, нават лепшы, бо ўкладвае ў працу ўсю душу». Дружба Карнача і Шугачова засноўваецца, думаецца, перш за ўсё на роднаснасці іх натур як творцаў, непасрэднасці і шчырасці ва ўзаемаадносінах. Аднак ёсць паміж гэтымі людзьмі і даволі істотная розніца.

Як зазначае сабе Карнач, Шугачоў «праз тое, напэўна, што акрамя свайго праекта больш нічога навокал не бачыць і не хоча бачыць, што адсутнічае ў яго шырыня мыслення, размах, а галоўнае — смеласць, прапісаны на ўсё жыццё да радавых». Гэта сапраўды так. Шугачоў смелы ў творчасці, але не ў паўсядзённым жыцці. І праз тое мусіць заставацца, нягледзячы на свой талент, у невысокім рангу загадчыка архітэктурнай майстэрні, быць проста выканаўцам.

Аднак, як і кожны творца, Віктар Шугачоў не можа прымірыцца з немагчымасцю рэалізацыі ўласнага патэнцыялу як архітэктара. «Я хачу зрабіць адзін подзвіг як мастак,— гаворыць ён Карначу.— Як грамадзянін я зрабіў подзвіг. Вайна разбурыла гарады. Людзям не было дзе жыць. Партыя паставіла грандыёзную задачу: забяспечыць людзей жыллём. У самы кароткі тэрмін і самым танным — па нашых магчымасцях… […]. І я, як салдат, выконваў гэтую задачу. Дваццаць гадоў я праектаваў так, каб эканоміць на кожным метры, на кожнай лесвічнай пляцоўцы, на камунікацыях, на пажарнай лесвіцы, на кустах у дварах. Я наступіў на горла ўласнай песні. Ахвяраваў талентам, творчым прэстыжам. Адмовіўся ад свайго імя. Дзе хто прачытае, што гэта збудавана па праекце Шугачова? Ды і не хачу я, каб на дамах на Маскоўскай стаяла маё імя. […] Але мне пайшоў шосты дзясятак... І я не страціў надзеі збудаваць нешта такое, чым бы людзі любаваліся! Ды не, не проста любаваліся! Дзе людзям было б зручна, прыгожа жыць. Я спецыялізаваўся на жыллі, і я хачу будаваць жыллё. Але такое, за якое не сорамна было б праз пяцьдзясят, сто гадоў».

Заданне на распрацоўку праекта эксперыментальнай забудовы раёна, выдадзенае яго майстэрні Карначом, дае магчымасць ажыц-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

цявіць запаветную мару. І Шугачоў апантана працуе, не шкадуючы сіл і часу. Ён не зважае нават на тое, што эксперыментальнае будаўніцтва могуць не зацвердзіць у вярхах. Цвяроза ацэньваючы свае магчымасці, у гэтым пытанні ён спадзяецца на непараўнальна больш «прабіўнога» Карнача, яго сваяцкія і сяброўскія сувязі з першым сакратаром гаркама партыі Ігнатовічам.

А Карнач бясконца канфліктуе з кіраўніцтвам горада і ў рэшце рэшт праз тое апынаецца пад пагрозай звальнення. Зразумела, што гэта расцэньваецца Шугачовым як пагроза здзяйсненню сваёй мары і наогул ледзь не як здрада іх агульнай справе. Аднак тыя эпітэты, якімі «ўзнагароджвае» Шугачоў у гэтых выпадках Карнача,— гэта мімалётнае выяўленне рэакцыі на непажаданы ход падзей, а не сапраўдных адносін да сябра: «Яму зусім не хацелася, каб сябра ішоў на ўніжэнне, на разбурэнне свайго адметнага характару. Але ўжо з партыйнай канферэнцыі лічыў, што Максім паводзіць сябе неразумна, непрактычна, па-хлапчукоўску. Чорт з табой, разводзься, жаніся, але рабі так, каб твае выкрутасы не адбіваліся на справе!»

Карнач — даўні сябра для ўсёй дружнай сям'і Шугачовых. І для Віктаравай жонкі Паліны, якая, у адрозненне ад Карначовай жонкі Дашы,— сапраўдная берагіня сямейнага ачага, апора і дарадчык мужа. І для дзяцей Шугачовых, да якіх ставіцца як да ўласнай дачкі. Заўважым, што нават не маці, а менавіта Карначу першаму сказала Вера Шугачова пра сваю цяжарнасць. І Карнач, як можа, стараецца дапамагчы ў вырашэнні той няпростай калізіі, якая ўзнікла паміж Верай і яе каханым. Дружба Шугачовых і Карнача засноўваецца на шчырасці, даверы, узаемападтрымцы.

Зусім іначай ставяцца да Карнача муж і жонка Макаеды, асабістыя ўзаемаадносіны якіх складаюць таксама самастойную сюжэтную лінію рамана. Для Браніслава Макаеда, кіраўніка адной з архітэктурных майстэрняў, Карнач ненавісны па той жа прычыне, што і Моцарт для Сальеры ў вядомай «маленькай трагедыі» А. С. Пушкіна: зайздрасці да таленту. «Зайздросціў Карначу ва ўсім. Зайздрасць зрабіла яго злосным, дробязным, улюбёным у сябе. У маладосці яшчэ захоўвалася здольнасць паглядзець на сваю працу самакрытычна. Пазней ад самакрытычнасці нічога не засталося. Усё больш пераконваў сябе, што ён не менш таленавіты, але не ўмее атрымаць выгадны аб'ект і… паказаць сябе так, як гэта ўмее Карнач.

Макаеду ўсё свядомае жыццё хацелася кіраваць, але толькі маючы ўжо добрую лысіну, ён дабраўся да пасады кіраўніка майстэрні. Як яму хацелася стаць галоўным архітэктарам горада! Але дарогу пераступіў Карнач. Ужо адно гэта ён не мог дараваць быламу аднакурсніку!»



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Макаед, праўда, не атручвае свайго больш таленавітага калегу, як Сальеры, а стараецца, прыкідваючыся сябрам, так ці іначай «вырваць з-пад Карнача крэсла», абагнаць у кар'ерным росце. Таму настойліва адгаворвае Карнача ад прапанаванага яму пераходу на працу ў Дзяржбуд, нават ад пасады галоўнага архітэктара, матывуючы гэта згубнасцю для яго таленту: «Каб ты аддаўся творчасці цалкам, то даўно быў бы архітэктарам еўрапейскага маштабу». А калі над Карначом пачалі збірацца хмары, робіць усё, каб звярнуць на сябе ўвагу кіраўніцтва горада. Прапануе свой праект забудовы новага раёна, у адрозненне ад шугачоўскага зроблены па нарматывах стандартнай забудовы. Макаед перакананы, што пасля таго, як Генеральны сакратар ЦК КПСС на пленуме падкрэсліў неабходнасць эканоміі сродкаў у капітальным будаўніцтве, дадатковых асігнаванняў на эксперыментальнае будаўніцтва не дадуць. І ён абыдзе са сваім праектам і Карнача, і Шугачова, якому зайздросціць не менш. Не дзіва, што выступаючы ў час разгляду асабістай справы Карнача, Макаед аж «ап'янеў ад магчымасці… патаптацца» па суперніку, хоць і стараўся выглядаць аб'ектыўным. Ён не без падстаў асцерагаўся, што Карнач пры яго таленце можа апынуцца і ў Дзяржбудзе, і ў міністэрстве, а гэтага Макаеду не трэба ні ў якім разе.

Карнач цалкам мае рацыю, калі зазначае сабе, што Макаед «жыве толькі сабой». Такая ж мяшчанка і яго жонка Ніна, загадчыца кафедры ў інстытуце, дзе выкладае і Карнач. Для яе, як і для яе мужа, важная не справа, якой яна павінна служыць, а ўласны дабрабыт і магчымасць дыктаваць сваю волю іншым. Ды рабіць гэта так, каб знешне ўсё выглядала вельмі прыстойна. Гэта выяўляецца нават у яе асабістых дачыненнях з мужам, заснаваных на псіхалогіі спажывецтва. Макаеды фактычна ненавідзяць адно аднаго, пастаянна ваююць за ўладу ў сям'і. Але не разыходзяцца, бо гэта можа пакласці канец кар'ерам абаіх. Апроч таго, мужа прываблівае прыгажосць жонкі, а яе — магчымасць траціць на сябе не толькі свой немалы заробак, але і значную частку мужавага. Сквапнасць Ніны выяўляецца і ў тым, што ў свой час яна ненавідзела Карнача, паверыўшы мужу, што з-за яго «Макаеду няма ходу ў вялікую архітэктуру і гэта адбіваецца на іх дабрабыце…». Урэшце, і на спакушэнне Карнача, «учынак, нялёгкі нават для яе, з поглядамі яе і расчараваннем у мужы», яна ідзе таксама перш за ўсё па той жа прычыне. Бо паверыла, што Карнач хоча заняць яе месца, і разлічвала такім спосабам «паставіць у даволі далікатнае становішча магчымага конкурснага саперніка».

Нават успыхнуўшае каханне да Карнача не пазбаўляе Ніну цвярозага разліку — да яго яна згодна пайсці, але толькі «калі яе паклічуць,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

на руках панясуць». У парыве гневу прызнаўшыся мужу ў сваёй здрадзе і намерыўшыся пайсці з дому, яна вельмі хутка астывае і робіць выгляд, што проста пажартавала. «Куды яна пойдзе з гэтага цёплага гнязда? […] Хваля адхлынула. Адкрыліся камені быту, камфорту, які прыцягваў і звязваў. Смешна ў наш час пакідаць кватэру, на якую маеш права не меншае, чым ён». Выгадней памірыцца з мужам. І Ніна па-майстэрску разыгрывае ролю жонкі, якая проста жадала ўпэўніцца ў каханні мужа: «Я хацела праверыць, ці засталася ў цябе хоць рэўнасць. […] Ты, як папугай, паўтараеш мне словы пра каханне. Але дзе яно? Я не адчуваю яго. А я хачу кахаць! Я хачу кахаць! — Яна прытворна ўсхліпнула.— Ад гэтага я фантазірую чорт ведае што — абы зрабіць табе балюча».

Вельмі важнае значэнне ў мастацкай структуры рамана маюць і сюжэтныя лініі першага сакратара гаркама партыі Ігнатовіча і першага сакратара абкама Сасноўскага. Іх вылучэнне, думаецца, было абумоўлена жаданнем пісьменніка больш выразна выявіць свой погляд на праблему метадаў партыйнага кіраўніцтва. Падкрэслім, што гэтая праблема была ў тыя часы надзвычай важнай, бо кіруючая партыя аказвала вырашальны ўплыў на жыццё грамадства.

Тады, у 1960 — 1970-я гады, да нас дакаціліся першыя хвалі навукова-тэхнічнай рэвалюцыі. І на кіраўнічыя пасады ў партыйных органах пачалі масава вылучаць спецыялістаў розных галін вытворчасці. Гэта былі кіраўнікі так званага новага тыпу, да ліку якіх належыць і Ігнатовіч. У адрозненне ад многіх кіраўнікоў старэйшага пакалення, да якога адносіцца Сасноўскі, яны былі больш адукаваныя. З вытворчасці яны прыўнеслі ў новую для сябе справу рацыяналізм у яе арганізацыі, што ўвогуле было і нядрэнна. Горш тое, што з той жа вытворчасці многія з іх прыўнеслі ў партыйную работу і стаўленне да чалавека перш за ўсё як да нейкай вытворчай адзінкі, выканаўцы пэўных дакладна вызначаных функцый, за межы якіх выходзіць нельга, няўвагу да людской псіхалогіі.

Палемізуючы ў думках з сакратаром абкама партыі Сасноўскім, які, наадварот, надаваў гэтай псіхалогіі вялікае значэнне, ведаў і памятаў тысячы людзей, з якімі даводзілася сутыкацца, Ігнатовіч заначае: «Паспытаў бы ты, Леанід Мінавіч, гаспадарчага хлеба, з якога пачынаў ён, інжынер Ігнатовіч. Там псіхалогія — справа другарадная. Ходзячы на імяніны да рабочых, прадукцыйнасці працы не ўздымеш». Ён лічыць, што такая ўвага да людзей «зусім не абавязковая для кіраўніка новага тыпу, якому трэба ажыццяўляць кіраўніцтва па-навуковаму, з прымяненнем навейшай тэхнікі і новых метадаў». Кажучы іначай, Ігнатовіч, як і многія іншыя падобныя да яго,

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

недаацэньвае тое, што назваюць цяпер «чалавечым фактарам». Важнасць яго грамадства ўсвядоміць пазней.

Увогуле Ігнатовіч — чалавек не такі і благі. Яму не адмовіш у розуме, руплівасці і адказнасці ў выкананні службовых абавязкаў, уменні арганізаваць працу падначаленых. Нарэшце, у імкненні зрабіць «свой» горад лепшым за многія іншыя ва ўсіх адносінах, у тым ліку і ў архітэктурных. Як кіраўнік, ён мае бясспрэчныя вартасці і заслугі, чым не без падстаў і ганарыцца. Гэта ж ён, ведаючы Карнача са студэнцкіх гадоў, прапанаваў яму пасаду галоўнага архітэктара. Больш за тое, даў яму непараўнальна большую, чым у галоўных архітэктараў у іншых гарадах, свабоду ў вырашэнні архітэктурных пытанняў. Падтрымаў ідэю Карнача наконт будоўлі новага раёна горада паводле індывідуальнага праекта, разам з ім і Шугачовым рыхтаваў і накіроўваў у вышэйшыя інстанцыі просьбы аб дазволе на такое будаўніцтва і выдзяленні адпаведных сродкаў.

Аднак погляд на чалавека як на выканаўцу пэўных функцый, тая абмежаванасць раз і назаўсёды вызначанымі для сябе рамкамі магчымага і дазволенага, пра што мы гаварылі вышэй, шкодзяць і самому Ігнатовічу, і справе, якой ён служыць. Заўважым, што галоўным клопатам гэтага чалавека з’яўляецца «адпавядаць». Адпавядаць званню сем’яніна, бацькі, камуніста-кіраўніка, сваёй пасадзе, патрабаванням статута партыі, маральнага кодэкса будаўніка камунізму, пастаноў партыі і ўрада, вышэйстаячых органаў, рознага роду інструкцый — нават у дробязях. Менавіта ў гэтым ён бачыць галоўны крытэрый свайго прэстыжу ў вачах падначаленых і кіраўніцтва, а таму так балюча рэагуе на ўсё, што на яго думку можа падарваць гэты прэстыж. І ў складаных для сябе сітуацыях заўсёды стараецца ўзгадніць свае дзеянні з вышэйстаячымі інстанцыямі, перш за ўсё з Сасноўскім.

У прынцыпе, нічога кепскага ў гэтым быццам і няма. Усялякая сумесная дзейнасць ў якой заўгодна сферы жыцця патрабуе арганізацыі, дакладнага размеркавання абавязкаў і сумленнага іх выканання кожным, захавання пэўных правіл і нормаў паводзін. Без гэтага нельга. Аднак нават у самых разумных пастановах, інструкцыях, немагчыма прадугледзець усе калізіі нават дня сённяшняга, не кажучы ўжо пра заўтрашні. А жыццё, між тым, ідзе, ставячы новыя задачы, якія патрабуюць новых рашэнняў, часам рызыкі, парушэння існуючых нормаў і правілаў. Ігнатовіч такога сабе не дазволіць, што прыводзіць да страты таго сапраўды чалавечага, што ў ім ёсць.

Намер Карнача развесціся з жонкай, яго сімпатыя да сакратаркі Ігнатовіча, накіраванне Карначом без Ігнатовічавай згоды ліста ў вышэйшыя інстанцыі з пратэстам супраць «пасадкі» хімічнага



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

камбіната ў Белым Беразе ствараюць немалыя праблемы першаму сакратару гаркама партыі. Яны ўспрымаюцца ім як недаравальнае парушэнне ўсіх нормаў чалавечых і службовых адносін, што кідае цень і на яго аўтарытэт. І таму Ігнатовіч дае ход заяве жонкі Карнача, не зрабіць чаго, праўда, і не мог. А ў дадатак накіроўвае ў архітэктурнае ўпраўленне камісію на чале з людзьмі, якія зробяць усё, каб знайсці падставы для звальнення яго кіраўніка.

У час абмеркавання асабістай справы Карнача на бюро гаркама партыі Ігнатовіч стараецца захаваць бачнасць бесстароннасці і прынцыповасці ў сваіх паводзінах: «Герасім Пятровіч… абдумваў пазіцыю, якую ён павінен заняць. Уласна кажучы, пазіцыя можа быць толькі адна. Нельга не пагадзіцца з Лізай, якая ўпікнула яго, што, маўляў, усе «карначоўскія выбрыкі» — ад яго, Ігнатовіча, лібералізму і прымірэнства. Не можа ён чакаць, каб такі ж папрок, як жонка, кінуў яму Сасноўскі ці яшчэ хто-небудзь зверху».

Ігнатовіч прыкідвае, як у дадзенай сітуацыі зрабіць так, каб і козы былі цэлыя, і ваўкі сытыя: «Няхай гэта будзе апошняе праяўленне яго ліберальнасці. Карнач гэтага, безумоўна, не ацэніць, але яго, Ігнатовіча, сумленне будзе чыстае. За хамства былога сябра ён меў магчымасць і падставы добра-такі пляснуць яго. Але не робіць гэтага па дабраце сваёй. Вырашыў суровай вымовы, як патрабуе Ліза, не запісваць. Члены бюро згодзяцца, што вызваленне ад пасады — кара немалая, для каго іншага — найвышэйшая. Але ён, Ігнатовіч, ведае, што для такога архітэктара, як Карнач,— гэта не трагедыя. А ўлічваючы адносіны з Дашай, для Максіма гэта будзе найлепшае выйсце. Вызвалены ад працы, але з чыстай учотнай карткай, ён, безумоўна, адразу ж паедзе ў Мінск ці іншы горад, можа, нават за межы рэспублікі, бо нішто яго не трымае тут,— і справа будзе закрыта. Назаўсёды. Для яго, Ігнатовіча, будзе закрыта. Ён будзе пазбаўлены ад Карначовых фартэляў, ад праблем, якія той бясконца стварае сваёй дзейнасцю, сваім неспакойным характарам. Некалі гэты характар галоўнага архітэктара добра памагаў старшыні выканкама Ігнатовічу. Але цяпер у такім памочніку няма патрэбы». Зноў-такі, як бачым, Ігнатовіч клапоціцца найперш пра сябе, уласную кар'еру, а не пра людзей, пра агульную справу. Такім чынам ён, па сутнасці, неўпрыкмет для сябе далучаецца да таго самага мяшчанства, з якім, як ён лічыць, бескампрамісна змагаецца.

Карнача звольнілі з пасады быццам і «па заслугах». Знешне паводзіны Ігнатовіча выглядалі як праява яго партыйнай прынцыповасці, якая патрабуе не зважаць на сваяцкія і сяброўскія сувязі. Цяпер нішто, здаецца, не пагражае яго аўтарытэту, не замінае рабіць тое,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

што, на яго думку, можна і трэба рабіць. Пагадзіцца, насуперак доводам Карнача пра шкоднасць для горада, на «пасадку» хімічнага камбіната ў Белым Беразе. Бо такі аб'ект — як падарунак, адмовіцца ад якога — несусветнае глупства, якога і ён сам сабе, і начальства яму не даруе. Гэта ж і рабочыя месцы, і фінансы, і жыллё: «Ігнатовіч халадзеў ад думкі, што Карначова ўпартасць, яго пратэст супраць пабудовы камбіната ў Белым Беразе можа прывесці да таго, што такі выгодны ва ўсіх адносінах аб'ект перададуць іншаму гораду, хімікі пагражалі зрабіць гэта.

Але разам з тым, ён, Ігнатовіч, не архітэктар, разумеў Карначоў клопат пра будучыню горада і ў душы паважаў яго прынцыповасць. Ні перад чым чалавек не спыніўся: ні перад пагрозай звальнення, вымовы, разрыву сяброўства. Больш таго, Ігнатовіч употай зайздросціў такой смеласці і прынцыповасці. Сам ён спыняецца і адступае часцей, апраўдваючы гэта тым, што на яго месцы інакш нельга. […] А яшчэ з'явілася дзіўнае адчуванне: як бы ён нешта страціў ці ў чым атрымаў паражэнне ад невядомага праціўніка. Сапраўды дзіўна. Што ён мог страціць? Хто і ў чым мог яго перамагчы?»

Ігнатовіч пакуль толькі адчувае, а не разумее, што страціў больш, чым набыў. Страціў дружбу чалавека, які не дазваляў яму спыніцца ў развіцці, даваў прыклад шчырасці, незашоранага погляду на любую з'яву, адданасці справе і смеласці ў абароне яе інтарэсаў. Але сам факт таго, што Ігнатовіч усумніўся ў вартасці зробленага, абуджае пэўную надзею на магчымыя змены да лепшага ў яго характары.

Праўда, на такі несумленны ў адносінах да Карнача ўчынак Ігнатовіча ў нечым падштурхнула і па-майстэрску разыграная перад ім Карначовай жонкай роля ахвяры «гэтага дэспата». Дый Ігнатовічава жонка Ліза, старэйшая Дашына сястра, прафсаюзны дзеяч, старалася адпаведна настроіць мужа. Магчымы развод яна ўспрыняла не толькі як крах шчасця сястры, але і крах упэўненасці ва ўласнай прадбачлівасці, здольнасці кіраваць людзьмі. Гэта ж яна калісьці, працуючы яшчэ ў гаркаме камсамола, параіла Ігнатовічу пазнаёміць Дашу з Карначом, папярэдне сабраўшы пра яго ўсе магчымыя «звесткі і характарыстыкі». І выявілася, што памылілася, бо не можа ж быць вінаватай яе сястра. Да таго ж закранула і тое, што «з-за яе бязвольнасці так лёгка могуць лопнуць яе, Лізіны, перакананні і ўпэўненасць у сваёй сіле, у тым, што можна Карнача прымусіць лічыцца з нормамі і мараллю нашага грамадства». А таму вырашае не адступаць, і Дашу выратаваць, і давесці сабе, што і яна, і яе муж як кіраўнікі здольныя «вярнуць у гурт любую адбіўшуюся авечку» з дапамогай партыйнай арганізацыі:



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

«“Забудзь думаць пра развод! — рашуча загадала яна сястры.— Змагайся за сваё шчасце. Мы з Герасімам паможам!»

«Ды не хачу я, каб ён жыў са мной па загаду партбюро»,— захныкала Даша.

«Ты дрэнна ведаеш мужчын. Не ведаеш, што ім у такім узросце даражэй за ўсё. Служба. Не стане ён псаваць кар’еры. Атрымае папярэджанне — вернецца ў сям’ю...”» І Даша паслухала сестрыну параду, напісала ў гаркам партыі заяву, якая стала падставай для разгляду персанальнай справы Карнача. Акалічнасці падрыхтоўкі да яе абмеркавання, як і рашэнне па ёй, шмат у чым было вынікам таго, што і сам Ігнатовіч, як і яго жонка, усумніўся ў сваёй здольнасці «вярнуць у гурт» такую «авечку», як Карнач. І змагаўся перш за ўсё за захаванне ўласнага аўтарытэту кіраўніка.

Урэшце, Ігнатовіча ёсць каму паправіць. Галоўным чынам гэта робіць першы сакратар абкама партыі Сасноўскі, якога Ігнатовіч лічыць прыхільнікам састарэлых метадаў партыйнага кіраўніцтва. Гэты чалавек па сваім характары больш падобны да Карнача, чым да Ігнатовіча. У адрозненне ад апошняга, для сакратара абкама галоўнае — адпаведнасць таго, што ён робіць, інтарэсам людзей, а не проста выкананне рознага роду «функцый», сапраўдная, а не паказная прынцыповасць і адданасць справе. Самым важным у сваёй працы ён лічыць людзей, якіх ацэньвае па іх чалавечай сутнасці. Бо чалавек — пачатак усяму. Таму і пра сваіх падначаленых Сасноўскі ведае ўсё: «Не збіраў гэтых звестак знарок. Проста заўсёды жыла ў ім натуральная ўвага да кожнага чалавека, да жыцця любога работніка — прыбіральшчыцы, шафёра, сакратара райкама. Можа, таму ён рэдка памыляўся ў падборы кадраў, калі падбіраў сам, ніхто не навязваў».

Пра Ігнатовіча Сасноўскі думае так: «Чалавек акуратны. Звышакуратны. І лічыць сябе лепшым знаўцам прамысловасці, горада, кіраўніком новай фармацыі. Сасноўскі добра ведае, што сакратар гаркама думае пра яго. Нічога кепскага. Але прызнае яго кампетэнцыю толькі ў пытаннях сельскай гаспадаркі. Ды яшчэ, безумоўна, думае, што, маўляў, пастарэў Лёня, едзе на старым метадзе. Пастарэў — гэта праўда. Але не ўстарэў. А што датычыць метадаў, то ён, Сасноўскі, лічыць, што ў іх працы ні новых, ні старых метадаў няма, партыйная работа — не збор правілаў і інструкцый, старых і новых, а няспынная творчасць, штодзённая і штогадзінная. […] Вось так, Герасім. Хлопец ты добры, сучасны. Але быў бы яшчэ лепшы, каб табе трохі менш самаўпэўненасці і крыху больш самакрытычнасці».

Ведаючы слабыя бакі натуры Ігнатовіча, да гісторыі са звальненнем Карнача, талент і прынцыповасць якога меў магчымасць ацаніць, Сасноўскі паставіўся з падазрэннем. Занадта ўжо паспешліва, без



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

звычайнай у падобных выпадках кансультацыі з ім і фармальна бездакорна было гэта зроблена. Сасноўскі ведаў, што падстаў для звальнення ставала. Але ці будзе яно на карысць гораду? Дый чаму на тым бюро, нягледзячы ні на які ціск, не пагадзіўся з прапановай аб звальненні галоўнага архітэктара старшыня гарвыканкама Кіслюк? Той самы, які абыякава паставіўся да незаконнага выдзялення кватэры сыну Сасноўскага. З-за гэтай гісторыі першы сакратар абкама партыі быў нейкі час невысокай думкі пра Кіслюка і лічыў яго вылучэнне на адказную пасаду сваёй памылкай. Але паводзіны на бюро рэабілітавалі Кіслюка ў вачах Сасноўскага, пацвердзіўшы старую ісціну, што «кожны чалавек — загадка, і разгадаць яе адразу нялёгка». І ён вырашыў бліжэй прыгледзецца да Карнача, па дарозе завітаўшы на яго дачу.

Сустрэча з Карначом пераканала ў тым, што для гэтага чалавек горад, у якім ён ужо не галоўны архітэктар, па-ранейшаму важнейшы за ўласныя амбіцыі і нават уласны лёс. Ацаніў Сасноўскі і здольнасць Карнача не толькі адстойваць свой пункт гледжання, але і пагаджацца са слушнымі заўвагамі. І зразумеў, што страта такога архітэктара і чалавека пашкодзіць гораду. Таму ў вельмі тактоўнай форме прапануе Карначу вярнуцца на ранейшую пасаду. А потым, наколькі можна ашчаджаючы самалюбства Ігнатовіча, не загадвае, а раіць яму асабіста папрасіць аб гэтым Карнача.

Апроч гэтых скразных сюжэтных ліній у рамане ёсць мноства іншых, такіх, напрыклад, як лініі ўзаемаадносін Веры Шугачовай і яе каханага Вадзіма, Карнача і яго маці, сям'і сястры. Лініі гэтыя часам перасякаюцца, узаемна дапаўняючы адна адну, што дазваляе пісьменніку паўней адлюстраваць плынь тагачаснага жыцця за кошт «захопу» ўсё новых пластоў рэчаіснасці і больш глыбокага раскрыцця характараў персанажаў. Варта адзначыць і тое, што І. Шамякін праявіў вялікае майстэрства ў пабудове і сюжэта, і кампазіцыі твора. Асноўны спосаб арганізацыі матэрыялу ў «Атлантах і карыятыдах» — апавяданне «ўсёведаючага» аўтара, што стварае ілюзію бесстароннасці ў адлюстраванні рэчаіснасці. Галоўную ролю ў раскрыцці зместу твора адыгрываюць вобразы яго персанажаў. Іх учынкі, перажыванні ў жыццёва праўдападобных сітуацыях дазваляюць чытачу скласці дастаткова выразнае ўяўленне пра іх сацыяльную і чалавечую сутнасць, а ў канчатковым выніку прыйсці да ўсведамлення ідэйнай скіраванасці рамана. Вялікае значэнне для таго мела вылучэнне вобраза Карнача як своеасаблівага кампазіцыйнага цэнтра твора, на якім так ці іначай завязваюцца ўсе яго сюжэтныя лініі і трымаецца храналагічная паслядоўнасць у адлюстраванні рэчаіснасці.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Эпізоды з жыцця Карнача перамяжоўваюцца з апісаннем падзей, якія адбываюцца ў той жа час з іншымі персанажамі і ў іншых месцах. Гэта ў значнай ступені павышае дынаміку развіцця сюжэта і ў той жа час аблягчае ўспрыманне твора чытачом. Яму прасцей арыентавацца ў ходзе развіцця падзей, а пастаянная змена аб'ектаў адлюстравання пазбаўляе ад той стомленасці, прытуплення ўвагі, якая назіраецца пры доўгай канцэнтрацыі на нейкім адным прадмеце.

Храналагічная паслядоўнасць апавядання парушаецца толькі ў тых выпадках, калі мастак слова хоча глыбей раскрыць характар персанажа, выявіць нейкія істотныя моманты сітуацыі, чым дасягаецца і пэўнае пашырэнне сюжэта. Так, напрыклад, сутнасць натуры Дашы Карнач дастаткова выразна выяўляецца нават у эпізодах, звязаных з вяселлем дачкі. Але без успамінаў Карнача пра гісторыю ўзаемаадносін з жонкай, спробаў разабрацца ў першапрычынах іх разладу, было б абсалютна незразумела, чаму ён звязаў свой лёс з такой жанчынай. І вобраз яго ўспрымаўся б зусім іначай.

Для раскрыцця характараў персанажаў аўтар рамана выкарыстаў пераважна прамую форму псіхалагічнага аналізу. Для яе характэрна выяўленне думак і настрояў герояў праз паказ іх паводзін, маналогі і дыялогі, непасрэдную фіксацыю думак і перажыванняў «усёведаючым» аўтарам. Вось як паказвае І. Шамякін, напрыклад, думкі і перажыванні Карнача ў пачатку пасяджэння бюро гаркама партыі, на якім мелася разглядацца яго персанальная справа: «Ігнатовіч нейкую хвіліну праглядаў паперы, даючы тым, хто ўвайшоў, сесці і «перавесці дыханне».

Пасля агледзеў прысутных — ці ўсе ў зборы? — і сказаў ветліва, неафіцыйна:

— Просім, Максім Яўцехавіч.

Гэтая яго ветлівасць чамусьці ўразіла Максіма горш за грубасць. Ён з натугай падняўся і пайшоў да століка, што стаяў насупраць доўгага стала, як бы адпілаваны ад яго — такой жа канфігурацыі. […]

Убачыўшы, як глядзяць на яго члены бюро — людзі, з якімі ён столькі год разам працаваў, з некаторымі нават гуляў у прэферанс, Максім сумеўся і ўзбунтаваўся. Дзіўна глядзяць, незвычайна, адчужана. Чаму? Ці, можа, яму гэта толькі здаецца? Не ўсе ж так глядзяць. Кіслюк, напрыклад, глядзіць з дакорам і шкадаваннем. Але зноў жа — чаму? Што ж ім сказаць? Навошта ім той даклад, які ён падрыхтаваў у галаве — з пералікам аб'ектаў, з лічбамі, з праблемамі вырашанымі і нявырашанымі? Калі ён выступае ў гэтым кабінеце апошні раз, то павінен сказаць нешта асаблівае, самае галоўнае. А што галоўнае? Што галоўнае? У той забудове, якая будзе весціся без яго,— Зарэчны



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

раён. Але, ён павінен сказаць пра гэта. Сядзяць жа разумныя людзі. Можа, зерні, якія ён сыпане апошні раз, у некага прарастуць і нехта калі-небудзь падтрымае Шугачова, каму працаваць і працаваць тут».

Карнач разумее, што разгляд яго персанальнай справы закончыцца, хутчэй за ўсё, звальненнем з пасады, што ўсё фактычна прадвырашана. І таму так карабаціць яго ненатуральная неафіцыйнасць Ігнатовіча, адчужанасць у вачах добра знаёмых членаў бюро. Карнач перакананы, што яго справаздача нічога не зменіць у іх пазіцыі, і адзінае, што ён можа зрабіць карыснага для горада — выкарыстаць магчымасць у апошні раз паспрабаваць давесці слушнасць забудовы новага раёна паводле праекта Шугачова. З таго і пачынае, выклікаўшы недаўменне прысутных. Але неўзабаве абрывае свой «даклад» на паўслове, убачыўшы нежаданне большасці прысутных слухаць: «Нейкую хвіліну чакалі, што ён прадоўжыць.

— У вас усё? — здзіўлена спытаў другі сакратар Доўжык.

Пракурор Мацвейчык скептычна хмыкнуў:

— Небагата.

— А што яшчэ трэба?

— Ваш даклад аб рабоце…

— Навошта?

— Як навошта?! — сказаў Ігнатовіч тонам настаўніка, які папярэджвае непаслухмянага ўпартага вучня.

Галава кружылася. Максім спалохаўся — не ўпасці б. Асцярожна пайшоў да свайго крэсла, сеў пад абуранымі позіркамі большасці членаў бюро. Адтуль сказаў:

— У вас ёсць заява маёй жонкі. З яе пачалося. З яе і пачынайце. Пры чым тут архітэктура да маіх адносін з жонкай?

Ігнатовіч падняўся з крэсла, і яго трохі сутуленая постаць адразу набыла афіцыйную строгасць.

— Таварыш Карнач! Вырашае гарком, каго калі і аб чым слухаць. Да вашых адносін у сям'і дойдзем, не хвалюйцеся. Між іншым, не вам трэба тлумачыць, што ў жыцці ўсё ўзаемазвязана. Ваша бытавая распушчанасць не магла не адбіцца на рабоце… — але тут жа зразумеўшы, што «перабраў» з распушчанасцю, ведаючы Карначоў характар, нельга так, і таму змякчыў — параіў амаль дабразычліва:

— Не ўскладняй свайго становішча, Максім Яўцехавіч…».

У гэтым дыялогу, паводзінах персанажаў выразна выяўляецца незадаволенасць Ігнатовіча і членаў бюро парушэннем Карначом «правіл гульні»,— не адчувае сябе ён «падсудным», самавольнічае. І не ў меншай ступені — няўхільнае непрыманне галоўным героем рамана фармалізму, фальшу, ухілення ад сутнасці справы.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Выкарыстаў пісьменнік і такі кампазіцыйны прыём раскрыцця характару героя, як апісанне яго сну-трызнення. У ім хворы Карнач бачыць перш за ўсё тое і тых, што было важным для яго — маці, горад, Дашу. Як і часта бывае ў снах, там «рэальныя падзеі і галасы жывых людзей перамешваліся з неверагоднымі, фантастычнымі карцінамі, размовамі з тымі, каго ўжо няма. Успомніў пахаванне маці амаль з той жа дакладнасцю, як і было ў сапраўднасці. І тут жа маці прыходзіла жывая. І ён, помнячы, што яна памерла, не здзіўляўся». Пры ўсёй фантастычнасці, нават містычнасці калейдаскопа карцін гэтага сну яны многае праясняюць у адносінах Карнача і да Дашы, і да дачкі, і да справы яго жыцця — таго горада, які ён марыў пабудаваць.

Даволі шырока скарыстаў І. Шамякін і выяўленчыя магчымасці ўскоснай формы псіхалагізму — аб'ектыўванага апавядання, пры якім характар, унутраны стан героя выяўляецца галоўным чынам праз знешнія прыкметы яго душэўнага стану. Яскравым прыкладам таго з'яўляецца эпізод, у якім Карнач выказвае, няхай сабе і ў вельмі карэктнай форме, але балючы папрок Сасноўскаму за тое, што ён пагадзіўся на незаконнае выдзяленне кватэры для свайго сына. Выслухаўшы Карнача, Сасноўскі «нейкі час з вялікай цікавасцю глядзеў на чалавека, які папрасіўся на прыём, каб сказаць вось такое. Максім не вытрымаў — адвёў позірк. Пасля шкадаваў: не паспеў разгледзець, што было ў вачах Леаніда Мінавіча. Бо праз хвіліну Сасноўскі нахіліўся над сталом, як бы падрыхтаваўся бадануць галавой. Праз мяккія, як у дзіцяці, сівыя і ўжо моцна парадзелыя валасы відно было, як наліваецца чырванню цемя.

Усталявалася паўза ўзаемнай няёмкасці. […]

Леанід Мінавіч правёў далонню па твары, як бы сцёр усё, што там адбілася ад Карначовых слоў. І сапраўды, калі падняў галаву і зірнуў, твар яго быў спакойны, з заўсёднымі смяшынкамі ў вачах і ў маршчынках каля рота, толькі хіба больш выразна, чым хвіліну назад, вырысоўвалася стомленасць чалавека, які рана пачаў свой працоўны дзень і працаваў напружана.

— Слухай, Карнач, будзь шчырым да канца. Дапусцім, я не паламаю гэтага. Што будзеш рабіць? — нечакана весела і на «ты» спытаў Сасноўскі.

— Нічога. Проста я буду мець яшчэ адно расчараванне.

Сасноўскі адкінуўся на спінку крэсла, з хітрынкай прыжмурыўшы вочы, і зноў агледзеў Максіма з сур'ёзнай цікаўнасцю.

— Вось ты які! — і нечакана спружыніста падняўся.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Максім таксама падняўся трохі разгубленым, не ведаючы, як развітацца пасля таго, што ён сказаў тут. Сасноўскі выручыў яго — працягнуў цераз стол руку:

— Дзякую за шчырасць».

У жэстах, позірку, ва ўсіх паводзінах Сасноўскага адгадваецца многае. І здзіўленне смеласцю Карнача, і няёмкасць за праяўленую самім беспрынцыповасць, бацькоўскую слабасць. І жаданне праверыць, наколькі далёка сягае смеласць і прынцыповасць Карнача. Гэта і прыкмета ўжо прынятага для сябе рашэння выправіць сваю памылку. Нарэшце, пераход на «ты» — своеасаблівае выяўленне павагі, прызнанне Карнача як асобы роўнай Сасноўскаму.

А «тэатральнасць» паводзін Дашы Карнач пастаянна падкрэсліваецца тым, што яна нават у крытычных абставінах хоць на момант, але зазірне ў люстэрка, нібы правяраючы, наколькі адпавядае яе выгляд ролі, якую разыгрывае.

Такі распаўсюджаны ў літаратуры прыём, як раскрыццё настрою персанажа праз апісанне пейзажу, у рамане сустракаецца вельмі рэдка. Можна ўспомніць хіба толькі карціну лістападаўскага вечара, з якой пачынаецца твор. Холад і няўтульнасць гэтага вечара яшчэ больш выразна адцяняюць настрой Карнача пасля партыйнай канферэнцыі. Ён адчувае сябе адзінокім, не зразуметым нікім і нейкім беспрытульным.

Безумоўна, багаты творчы вопыт дазваляў пісьменніку хутчэй знаходзіць аптымальныя рашэнні ў плане кампазіцыі, сюжэта, выкарыстання кампазіцыйных сродкаў і прыёмаў. Пазней ён сцвярджаў, што «ніводзін іншы раман не пісаўся так хутка і весела»[1]. Думаецца, аднак, што, як і кожная праца, стварэнне «Атлантаў і карыятыдаў» не абыходзілася для пісьменніка без пэўных цяжкасцей. У прыватнасці, не адразу акрэслілася і сама назва будучага твора. Існавала некалькі яе варыянтаў, у тым ліку і «Галоўны архітэктар». Ды, відаць, аўтар палічыў яе залішне пафаснай і не адпавядаючай зместу. Бо яна давала магчымасць трактоўкі вобраза галоўнага героя як героя новага часу, не проста галоўнага архітэктара горада, а нават, так бы мовіць, архітэктара жыцця. Між тым Карнач, пры ўсіх яго станоўчых якасцях, у рамане не нашмат узвышаецца над многімі іншымі. Ён не пазбаўлены і пэўных недахопаў, што ўласцівыя многім людзям.

У рэшце рэшт раман атрымаў назву «Атланты і карыятыды», нейтральную ў адносінах да яго герояў і гераінь. Бо ў архітэктуры атланты — гэта мужчынскія, а карыятыды — жаночыя фігуры, прызначэнне якіх аднолькавае — служыць апорай для бэлек або ўсяго будынка. Сам І. Шамякін на адной з сустрэч з чытачамі падкрэсліў, што гэты

[1] Шамякін, І. Начныя ўспаміны... — С. 474.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

загаловак трэба разумець як «мужчыны і жанчыны»[1]. І сапраўды, на людзях, мужчынах і жанчынах трымаецца будынак чалавечага свету, ад іх залежыць, застанецца ён трывалым на стагоддзі або разбурыцца.

Першым чытачом і крытыкам рамана стаў прататып яго галоўнага героя — Андрэй Макаёнак. Яго ацэнка новага твора была адназначна высокай: «…гэта ўдача. Такога рамана ў нас яшчэ не было»[2]. І сапраўды, упершыню апублікаваныя ў трох першых нумарах часопіса «Полымя» за 1974 год, «Атланты і карыятыды» сталі значнай з'явай у тагачаснай савецкай літаратуры. У тым жа годзе раман выйшаў асобным выданнем, апроч таго быў надрукаваны ва ўсесаюзным літаратурным часопісе «Дружба народов». А ў наступным годзе — яшчэ і ў «Роман-газете», якая выдавалася мільённымі тыражамі і распаўсюджвалася па ўсім Савецкім Саюзе. Пазней «Атланты і карыятыды» неаднаразова перавыдаваліся, і не толькі на беларускай мове, але і ў перакладах на мовы народаў СССР і краін сацыялістычнай садружнасці.

Папулярнасць твора ў чытацкім асяроддзі была вельмі вялікай. Яго чыталі, пра яго гаварылі, спрачаліся — і ў прыватным парадку, і на шматлікіх чытацкіх канферэнцыях. І не дзіва, бо ў рамане, як у люстэрку, адбівалася сама сучаснасць з яе супярэчнасцямі і праблемамі, актуальнымі для ўсяго грамадства і кожнага асобнага чалавека. Пытанні пра тэндэнцыі развіцця грамадства, яго маральныя асновы, маральныя асновы вытворчых, сямейных, сваяцкіх і сяброўскіх узаемаадносін, узаемадачыненняў бацькоў і дзяцей так ці іначай тычыліся ўсіх без выключэння. Прываблівала ў «Атлантах і карыятыдах» і вернасць праўдзе жыцця, шматграннасць ў паказе тыповых для таго часу характараў і абставін. Твор міжволі прымушаў больш пільна прыглядзецца да сутнасці звыклага, таго, што ўстаялася — і ў навакольным жыцці, і ў сабе самім. Да таго ж «Атланты і карыятыды», як і іншыя творы І. Шамякіна, вызначаліся «чытэльнасцю», што ў многім абумоўлівалася як добра сканструяваным сюжэтам, так і дынамічным яго развіццём.

Аператыўна адгукнулася на з'яўленне «Атлантаў і карыятыдаў» і літаратурная крытыка. Ужо ў чэрвені 1974 года ў штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва» пад загалоўкам «Патрэбны чалавек Максім

---

[1] Гл.: Родчанка, М. Маральна-этычная праблематыка ў рамане І. Шамякіна «Атланты і карыятыды» // Беларуская літаратура.— Мінск, 1979.— Вып. 7.— С. 116.

[2] Шамякін, І. Начныя ўспаміны…— С. 474.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Карнач» была змешчана ці не першая рэцэнзія на раман. Яе аўтар, А. Марціновіч, гаварыў пра твор, як пра значную з'яву ў тагачаснай беларускай прозе. І. Шамякін, падкрэсліваў крытык, выступіў, як заўсёды, «у ролі першапраходцы, які не баіцца ні вострых пытанняў, ні складаных праблем сучаснасці». «Новы раман «Атланты і карыятыды»,— адзначаў А. Марціновіч,— таксама сучасны, дакладней нават будзе сказаць — востра сучасны»[1].

Крытык вельмі слушна гаварыў пра шматпланавасць твора, разнастайнасць і цесную ўзаемасувязь пастаўленых у ім праблем творчага, вытворчага і маральнага характару. Нямала вартага ўвагі сказаў А. Марціновіч пра асаблівасці сюжэта і вобразнай сістэмы твора. Праўда, ён разглядаў перш за ўсё вобразы Карнача, Віктара Шугачова, Ігнатовіча, Макаеда ды Сасноўскага, і пры гэтым асноўны акцэнт рабіў на раскрыцці грамадскай пазіцыі герояў. Крытык цалкам слушна сцвярджаў, што Карнач, Шугачоў і Сасноўскі «мысляць і дзейнічаюць па-дзяржаўнаму, і як камуністы разумеюць, што самы суровы і патрабавальны суддзя — час, па-сапраўднаму ацэніць смеласць і правільнасць іхніх рашэнняў». У заключных радках рэцэнзент пісаў: «Максім Карнач — чалавек патрэбны. Пабольш бы такіх неспакойных, «канфліктуючых» людзей сярод нас. Яны многае могуць зрабіць. І, вядома, пабудаваць сонечны, прыгожы горад будучага, дзеля якога жывуць і працуюць»[2].

У пачатку верасня 1974 года на старонках «Сельскай газеты» ўбачыла свет рэцэнзія на раман, напісаная Я. Герцовічам, якая ў пэўным сэнсе нібы дапаўняла сказанае А. Марціновічам. Я. Герцовіч больш падрабязна гаварыў пра мастацкія якасці рамана і тую небяспечную для грамадства маральную хваробу, выразныя прыкметы якой пісьменнік убачыў у жыцці і адлюстраваў у сваім творы — мяшчанства. Аўтар артыкула, у прыватнасці, зазначаў: «Раман Івана Шамякіна — адзін з тых сапраўды мастацкіх твораў, дзе стаўленне чалавека да жыцця, да спраў і задач свайго народа даследуецца ўсебакова, з улікам усіх узаемасувязяў, уплываў, станоўчых і адмоўных фактараў. […] Пісьменнік расставіў сілы ў рамане так, што ўсім персанажам дадзена поўная магчымасць выявіць сваю чалавечую сутнасць, свой характар, сваё светаадчуванне»[3].

---

[1] Марціновіч, А. Патрэбны чалавек Максім Карнач // ЛіМ.— 1974.— 21 чэрв.— С. 4.

[2] Тамсама.

[3] Цыт. паводле: Герцович, Я. Когда тебе много дано (Заметки о новом романе Ивана Шамякина) // Сельская газета.— 1974.— 3 сент.— С. 4.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Дакладна і лаканічна крытык вызначыў сутнасныя рысы характару галоўнага героя твора: «…асоба маштабная, буйная, надзеленая розумам, талентам. Гэта чалавек з пачуццём партыйнага сумлення, уменнем адстойваць свае прынцыпы, не зважаючы ні на цяжкасці, ні на магчымыя страты для ўласнага дабрабыту»[1]. Асаблівую, бадай, увагу Я. Герцовіч аддаў канфлікту, які з'яўляецца своеасаблівым стрыжнем твора,— канфлікту маральнаму па сваёй прыродзе, сутнасць якога заключаецца ў супрацьстаянні духоўнасці і бездухоўнасці, прынцыповасці і беспрынцыповасці, праўдзівасці і дэмагогіі.

Сіла, што перашкаджае жыць і тварыць Карначу, тармозіць грамадскі прагрэс — гэта найперш мяшчанская своекарыслівасць, эгаізм канкрэтных мужчын і жанчын самага рознага ўзросту і сацыяльнага становішча, прыкрытыя абалонкай знешняй правільнасці слоў і паводзін.

Як падкрэсліў крытык, бацылы мяшчанства размножыліся ў душах не толькі жонкі Карнача, але і яе сястры, жонкі Ігнатовіча, і самога Ігнатовіча, мужа і жонкі Макаедаў. Ды распазнаць сучаснага мешчаніна, а тым больш абясшкодзіць яго нялёгка: «Максім Карнач змагаўся са славалюбствам загадчыка архітэктурнай майстэрні Браніслава Макаеда, бязлітасна крытыкаваў яго бяздарныя праекты, але прагледзеў, што гэты чалавечак шкодны не толькі гэтым. Значна больш небяспечнае яго ўменне даказваць недаказальнае, прыкрываць правільнымі словамі якую заўгодна несумленную справу»[2].

«Раман прымушае думаць пра месца чалавека ў жыцці, пра неразменнасць нашых прынцыпаў»[3],— зазначаў Я. Герцовіч. Тую ж думку знаходзім і ў крытычных водгуках на раман пасля яго публікацыі ва ўсесаюзных часопісах. Так, у артыкуле А. Аўчарэнкі, апублікаваным у 7-м нумары часопіса «Новый мир» за 1975 год, гаворыцца: «У цэнтры рамана беларускага пісьменніка Івана Шамякіна «Атланты і карыятыды» [...] таксама чалавек дзеяння, чалавек таленавіты — галоўны архітэктар горада Максім Карнач. Яго дзейнасць, узаемаадносіны з кіраўнікамі горада, сямейная драма — усё гэта аснова для сур'ёзнай гутаркі пра нашага чалавека наогул, пра маральныя асновы савецкага грамадства, пра складаныя праблемы дня і стагоддзя»[4].

---

[1] Цыт. паводле: Герцович, Я. Когда тебе много дано... — С. 4.

[2] Тамсама.

[3] Тамсама.

[4] Цыт. паводле: Овчаренко, А. Проблема человека и ее художественное решение // Новый мир.— 1975.— № 7.— С. 259.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Разам з тым крытык зазначаў: «Не ведаю, ці пераканаўчай падасца чытачу развязка рамана. Мне яна ўяўляецца аслабленай кан'юктурнымі ўплывамі. Наколькі рэалістычная ўся лінія ў рамане, звязаная з вобразам Ігнатовіча, настолькі ж ідылічныя часткі, у якіх раскрываецца цікава задуманы, але традыцыйна распрацаваны вобраз Сасноўскага»[1]. З такой заўвагай можна часткова пагадзіцца. Сапраўды, пярэчанне «пасадцы» буйных прамысловых прадпрыемстваў у выгадных для вытворчасці мясцінах, нават у цэнтры горада, для такіх вось упартых Карначоў зазвычай заканчвалася кепска. Будаўніцтва такіх аб'ектаў адкрывала для горада вялікія перспектывы развіцця. Бо ствараліся новыя рабочыя месцы, адпаведна выдзяляліся сродкі на будаўніцтва жылля, развіццё сацыяльнай інфраструктуры. І далёка не заўсёды знаходзіўся такі Сасноўскі, здольны ўбачыць і прадухіліць тую пагрозу для людзей, якую нясе ў сабе такая выгадная, здавалася б, справа. Аднак сказаць, што такіх не было зусім, таксама не выпадае — сярод партыйных кіраўнікоў людзі сустракаліся таксама розныя. Апроч таго, трэба ўлічваць і абставіны, у якіх пісаўся твор, абмежаванасць творчай свабоды аўтара пастулатамі метаду сацыялістычнага рэалізму. Ва ўсялякім разе пісьменнік здолеў сцвердзіць свой ідэал партыйнага кіраўніка, выразна акрэсліць тыя маральныя праблемы, ад вырашэння якіх залежыла вельмі многае ў жыцці народа.

У першыя гады пасля публікацыі рамана меркаванні пра яго выказваліся розныя, часам і дыяметральна супрацьлеглыя. Рэдакцыя часопіса «Литературное обозрение» наладзіла абмеркаванне твора. Пад рубрыкай з красамоўнай назвай «З розных пунктаў гледжання» былі змешчаныя тры артыкулы. Іх аўтарамі сталі беларускі літаратуразнаўца Ю. Пшыркоў, архітэктар А. Швідкоўскі і літаратурны крытык з Новасібірска В. Шапашнікаў.

У артыкуле пад назвай «У кроплі — акіян» Ю. Пшыркоў гаварыў пра раман, як пра значнае дасягненне І. Шамякіна, у якім выявілася яго ўменне «чуйна ўлоўліваць павевы часу і ў ледзь прыкметным яго цячэнні бачыць абрысы новага»[2]. Ён падкрэсліваў, што пісьменнік здолеў павесці вострую і прынцыповую размову пра маральна-этычныя асновы грамадства. «Само сабой зразумела, дарэмна чакаць ад пісьменніка вырашэння ўсіх закранутых у рамане праблем: задача мастака зусім не ў тым, каб на ўсё даваць гатовыя адказы. Заслуга

---

[1] Цыт. паводле: Овчаренко, А. Проблема человека... — С. 259.

[2] Цыт. паводле: Пширков, Ю. В капле — океан // Лит. обозрение.— 1975.— № 10.— С. 42.

Шамякіна ў тым, што ён узняў пытанні, якія патрабуюць адказаў»[1],— зазначаў крытык.

Архітэктар А. Швідкоўскі разглядаў твор перш за ўсё з пункту гледжання паўнаты і глыбіні раскрыцця ў ім прафесійных праблем, актуальных для яго самога і яго калег. Ён адзначаў, што «пісьменнік адным з першых у нашай літаратуры падышоў да праблем архітэктурнай творчасці сур'ёзна, з вялікай зацікаўленасцю. Ён імкнецца ўнікнуць у іх сутнасць, зразумець канфлікты, якія бытуюць у архітэктуры і выказацца на карысць такога іх вырашэння, якое забяспечыла б развіццё архітэктуры для людзей»[2].

А. Швідкоўскі фактычна засведчыў, што І. Шамякін праўдзіва адлюстраваў сутнасць таго, што адбываецца ў гэтай далёка не другараднай для побыту чалавека і фарміравання яго асобы сферы дзейнасці. І падкрэсліваў тыповасць сітуацыі, якая стала асновай вытворчага канфлікту ў рамане: «Сёння, па сутнасці, амаль ніводзін горад не можа развівацца без прамысловасці. Гарадскія ўлады заўсёды зацікаўлены ў тым, каб у горадзе быў пабудаваны буйны прамысловы камбінат, бо гэта дае грошы для будаўніцтва жылля, добраўпарадкавання горада, для пракладкі дарог. Гэта павялічвае колькасць насельніцтва горада, і, адпаведна, яго значэнне, яго магчымасці, яго развіццё.

І дзеля таго, каб атрымаць у свой горад буйное прамысловае прадпрыемства, гарадскія ўлады нярэдка ідуць на саступкі ведамствам, якія зацікаўленыя толькі ў вырашэнні сваіх вузкаведамасных задач.

Прамысловасць цягнецца да водных масіваў, таму часам гарадскія ўлады дазваляюць будаўніцтва буйных прамысловых прадпрыемстваў на берагах рэк. Прадпрыемствы забруджваюць ваду і паветра, а пад прамысловыя складскія тэрыторыі, чыгуначныя веткі адводзяцца лепшыя ўчасткі, якраз тыя, якія трэба было б адводзіць менавіта пад жыллё. Часта ведамствы «саджаюць» свае заводы ў самым цэнтры, побач з помнікамі архітэктуры»[3].

Што тычыцца мастацкіх вартасцей твора, то А. Швідкоўскі адзначыў, на яго погляд, «пэўны схематызм у абмалёўцы характараў, пэўную адназначнасць вобразаў і праблем, якія ў жыцці больш складаныя і шматпланавыя»[4]. Але гэта адзначалася як прыватны недахоп.

---

[1] Цыт. паводле: Пширков, Ю. В капле — океан.— С. 42.

[2] Цыт. паводле: Швидковский, О. Атланты — дети или пасынки // Лит. обозрение.— 1975.— № 10.— С. 43.

[3] Тамсама.— С. 44.

[4] Тамсама.— С. 45.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Артыкул В. Шапашнікава па ўсіх законах жанру дыскусіі быў палемічна скіраваны, па сутнасці, супраць абодвух астатніх. Крытык «разносіў» раман ушчэнт. Ён казаў пра другаснасць твора, пра адсутнасць у ім навізны праблематыкі, пра функцыянальнасць вобразаў герояў і залішняю ўвагу да інтымных падрабязнасцей іх жыцця, пра штучнасць галоўных сюжэтных ліній[1]. З многімі аргументамі і высновамі аўтара пагадзіцца, мякка кажучы, цяжка. Бо, па-першае, у ацэнцы рамана ён зыходзіць з уяўлення пра нейкі ідэальны твор, які абсалютна ні ў чым, нават у драбніцах, не паўтарае ўжо паказанага ў літаратуры.

«Героі Шамякіна спрачаюцца не толькі пра архітэктурныя праблемы, але і пра метады і стылі працы сучаснага кіраўніка, і пра партыйную этыку, і пра ўзаемаадносіны старэйшага і маладога пакаленняў... Але ж чытача цікавяць перш за ўсё самі героі, іх унутраны свет, іх жыццёвыя лёсы. Бо, як вядома, навізна кожнага літаратурнага твора вызначаецца зусім не тым, што аўтар здолеў пранікнуць у новую сферу жыцця, а тым, ці здолеў ён адкрыць новы тып героя, знайсці свой ракурс, свой арыенцір у даследаванні закранутых праблем. Вось такога мастацкага адкрыцця я тут якраз і не знаходжу»[2],— пісаў В. Шапашнікаў. Усё нібыта правільна. Аднак хіба ўнутраны свет чалавека не выяўляецца ва ўсім, што ён робіць? У працы, і ў спрэчках, і ў сямейным жыцці. Нарэшце, у тых жа «будуарных тайнах» герояў, за раскрыццё якіх крытык папракаў аўтара: «Амаль усе галоўныя героі І. Шамякіна, як мы пераканаліся, людзі са становішчам — адказныя партыйныя і савецкія работнікі, буйныя спецыялісты. Аўтар, нібы жадаючы давесці, што нічога чалавечае ім не чужое, час ад часу ставіць сваіх герояў у даволі пікантнае становішча, або расказвае пра іх самыя «патаемныя» думкі і жаданні». І далей: «...аўтар тут не столькі пранікае ва ўнутраны свет герояў, колькі як бы ловіць іх на месцы злачынства за грэшнымі думкамі і ўчынкамі»[3].

Ці не такі «ракурс» адлюстравання рэчаіснасці і раскрыцця ўнутранага свету героя, як недапушчальнасць «падрыву» аўтарытэту кіруючых работнікаў, навязвае пісьменнікам крытык? І ці справядлівыя яго папрокі ў «другаснасці» рамана па прычыне падабенства адлюстраваных у ім сітуацый з сітуацыямі ў творах іншых мастакоў слова? Думаецца, што не. На наш погляд, абсалютна меў рацыю Б. Анашанкаў, які крыху пазней і з трохі іншай нагоды зазначаў, што «сапраўднае мастацтва ніколі не лічылася і не лічыцца з

[1] Гл.: Шапошников, В. Состоялось ли открытие? // Лит. обозрение.— 1975.— № 10.— С. 45—46.

[2] Цыт. паводле: Шапошников, В. Состоялось ли открытие? — С. 45.

[3] Тамсама.— С. 46.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

банальнасцю (гэта графаманія рвецца абавязкова быць арыгінальнай), яно заўсёды зыходзіць з унутраных сваіх патрэб, законаў і азарэнняў, і калі пры гэтым выяўляе сябе праз банальную сітуацыю, то і гэтая сітуацыя становіцца ў шэраг выяўленчых сродкаў, які працуюць на аўтарскае адкрыццё, на звышзадачу.

Банальнасць (у руках мастака) выяўляе, набліжае да нас тыя грамадскія патрэбы, якія выклікалі да жыцця дадзены твор»[1].

Працягу распачатай дыскусіі ў «Литературном обозрении» не адбылося. Аднак гэта не азначала, што крытыкі страцілі ўсялякую цікавасць да рамана. Проста прыйшоў час больш глыбокага яго асэнсавання, вызначэння месца і значэння ў літаратурным працэсе. У працах даследчыкаў літаратуры «Атланты і карыятыды» разглядаліся не толькі з пункту гледжання асаблівасцей іх зместу і формы, але і ў аспекце выяўлення тэндэнцый як у станаўленні творчасці самога І. Шамякіна, так і ў развіцці нацыянальнай і ўсёй савецкай літаратуры.

Шмат слушнага было сказана, у прыватнасці, у артыкуле В. Каваленкі «Пазіцыя пісьменніка і духоўны свет героя», у якім аўтар аналізаваў новыя творы беларускіх празаікаў. Разглядаючы раман «Атланты і карыятыды», ён адзначаў, па-першае, блізкасць, але не тоеснасць характараў галоўных герояў твораў пісьменніка. Параўноўваючы Карнача з героем папярэдняга рамана І. Шамякіна «Снежныя зімы», крытык пісаў: «Максім Карнач больш упарты, мужны і паслядоўны ў сваім супраціўленні мяшчанству... Кахаючы Надзю, Антанюк не асмельваецца кінуць жонку-мяшчанку. У Карнача хапае ўжо ўнутранай сілы і на гэта. Разрыў Карнача з жонкай мае яшчэ больш прынцыповае значэнне ад таго, што ён ідзе на гэта не дзеля кахання да іншай жанчыны, а ў выніку сур'ёзнага разыходжання ў поглядах на жыццё»[2].

Разам з тым В. Каваленка вельмі слушна адзначыў, што галоўны герой твора не ідэалізуецца пісьменнікам, гэта адзін з шараговых людзей, «якія не нашмат узвышаюцца над іншымі і часам маюць тыя ж недахопы, што ўласцівыя іншым людзям. Але такая творчая пазіцыя пісьменніка… не ёсць зніжэнне духоўнасці, не ёсць паэтызацыя духоўнай заніжанасці, бо сам герой адчувае свой унутраны ўзровень, усведамляе свае магчымасці, глядзіць на сябе крытычна»[3]. Разрыў з жонкай, падкрэсліваў крытык, гэта не столькі бой Карнача

---

[1] Цыт. паводле: Анашенков, Б. Исцелися сам... (Черты литературы последних лет) // Вопросы литературы.— 1976.— № 1.— С. 57.

[2] Каваленка, В. Пазіцыя пісьменніка і духоўны свет героя // Полымя.— 1975.— № 12.— С. 201.

[3] Тамсама.— С. 202.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

з мяшчанствам, колькі «імкненне ўхіліцца ад уладных прэтэнзій мяшчанства захапіць яго ў сваю арбіту, падпарадкаваць сваёй злавеснай сіле. Максім не прымае жыцця, заснаванага на няшчырасці, эгаізме і бездухоўным практыцызме»[1]. Карнач, як зазначыў аўтар артыкула,— барацьбіт па натуры, можа ісці і на пэўныя вымушаныя кампрамісы, рабіць памылкі, але не здраджвае сваёй сутнасці чалавека і мастака.

Крытык слушна казаў пра вялікае грамадскае значэнне праблемы маральнага клімату ў сем'ях. Галоўную прычыну развалу сям'і Карнача ён не без падстаў бачыў у тым, што Даша не шукала і не знайшла такой справы, якая была б карысная не толькі для яе, але і для іншых. Усе сілы яна траціла не на сям'ю, а на самасцвярджэнне ў ёй за кошт інтарэсаў мужа. Эгацэнтрызм, памножаны на бездухоўнасць, прывёў да таго, што яна траціць здольнасць крытычна ацаніць свае паводзіны, іграе, як актрыса на сцэне, прыдуманую самой жа ролю, што і прыводзіць да краху сям'і[2]. Бясспрэчную значнасць маюць высновы В. Каваленкі пра сутнасць характару Ніны Макаед, хоць і тыповай мяшчанкі, але натуры не такой і простай. Ёй вядомыя і чыста чалавечыя пачуцці. Але да іх заўсёды дамешваецца і практычны разлік: «Пісьменнік пранікліва заўважыў і адкрыта сказаў, што ў мяшчанскім свеце няма чыстага кахання. Нават тады, калі яно мае трохі сардэчнасці, усё роўна «па сумяшчальніцтву» падзарабляе на выгаду»[3].

Пэўныя пярэчанні выклікае, праўда, заўвага пра адносіны Карнача і Віктара Шугачова. Пра іх характар В. Каваленка гаворыць як пра шчырую, сапраўдную мужчынскую дружбу, але разам з тым не пазбаўленую разліку на выгаду з боку Шугачова. Яму патрэбная падтрымка для ажыццяўлення праектаў, працы над якімі аддаў нямала часу і сілы. Зазначым, аднак, што і Карнач не менш зацікаўлены ў рэалізацыі праектаў Шугачова, таленавітага архітэктара. І Карнач, і Шугачоў хочуць зрабіць горад прыгажэйшым, больш зручным для жыцця. Мэта ў іх адна, і для яе дасягнення кожны з іх робіць тое, што ў яго сілах.

Значную ўвагу аддаў крытык і паказу пісьменнікам жыцця савецкіх і партыйных устаноў: «Прыёмныя, кабінеты, калідоры гэтых устаноў — не проста фон для дзейнасці галоўных герояў. Тут, як і ўсюды, кіпіць жыццё, адбываюцца канфлікты, пачуццё абавязку

[1] Каваленка, В. Пазіцыя пісьменніка... — С. 202.
[2] Тамсама.— С. 204.
[3] Тамсама.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

сутыкаецца з разлікам і баязлівасцю, перастрахоўкай, справа і творчасць прабіваюцца праз раўнадушша, эгаізм і зайздрасць. І галоўнае — тут менавіта сённяшні дух грамадскіх узаемаадносін, да якога заўсёды быў чулы І. Шамякін як пісьменнік. Вобразы партыйных і савецкіх кіраўнікоў у яго творчасці не спрошчаныя, не аднaзначныя, не прыхарошаныя, а складаныя — такія, якімі іх бачыць пісьменнік у жыцці»[1]. Так, менавіта ў калідорах улады маральныя асновы грамадства выяўляюцца найбольш выразна. І там, як паказаў В. Каваленка, разглядаючы вобраз Ігнатовіча, прыжываецца мяшчанства.

Самую пільную ўвагу на адзначаную праблему звярнулі і іншыя крытыкі. Так, напрыклад, Б. Анашанкаў пісаў: «Сэнсавы нерв рамана — супастаўленне сакратара абкама КПСС Сасноўскага і сакратара гаркама Ігнатовіча. Галоўны герой, архітэктар Карнач, фармальна застаецца ў баку, але па-за, акрамя гэтай зразумелай, а яшчэ больш — схаванай спрэчкі двух кіраўнікоў, зразумець яго немагчыма»[2]. Крытык лічыў, што пісьменнік дапусціў промах, не зрабіўшы галоўнай сюжэтнай лініяй менавіта супрацьстаянне названых партыйных работнікаў, не ўбачыў «усіх магчымасцей, у тым ліку і мастакоўскіх, у сэнсе глыбіны, маштабнасці характараў, якія таіла ўласная заяўка»[3].

Параўноўваючы Сасноўскага і Ігнатовіча, Б. Анашанкаў адзначаў: «Адзін — кіраўнік ленінскага тыпу, моцная, самабытная натура, непрыхільны да зададзенасці, умоўнасці, адданы не людзям, а справе, другі — маладзейшы, таксама энергічны, не дурны, адукаваны, не адмаўляе: «вучыўся ў Сасноўскага і шмат чаму навучыўся» (праўда, мы плёну гэтай навукі не бачым), захапляецца яго энергіяй, розумам, арганізатарскімі здольнасцямі, але зыходзіць у сваёй дзейнасці з таго, што многія якасці Сасноўскага, пры ўсёй іх станоўчасці, цяпер ужо састарэлі, далёка на іх не заедзеш»[4]. Крытык, на наш погляд, слушна падкрэсліў, што самая галоўная розніца паміж Сасноўскім і Ігнатовічам заключаецца ў тым, што Ігнатовіч па сваёй сутнасці — функцыянер, для якога нейкае самавольства нават у імя інтарэсаў агульнай справы прынцыпова немагчымае. Ён «занадта добра ведае, што і ў якіх межах дазволена, на гэтым будуе сваё жыццё і ў

[1] Каваленка, В. Пазіцыя пісьменніка... — С. 206.

[2] Цыт. паводле: Анашенков, Б. Исцелися сам…— С. 58.

[3] Тамсама.— С. 60.

[4] Тамсама.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

выніку губляе сябе як асобу, губляе (ёсць намёк) дзяцей, здраджвае дваццацігадовай дружбе...»[1]

Дружба Ігнатовіча з Карначом, як зазначаў крытык, разбураецца таму, што Карнач, як і Сасноўскі, «не ведае, і не жадае ведаць, што дазволена «чалавеку яго рангу, што не дазволена»[2], спрэс парушае «правілы гульні», кіруючыся толькі інтарэсамі справы, якой служыць. «І вось, каб задушыць у зародышы, папярэдзіць плёткі, паказаць «дыстанцыю», Ігнатовіч і б'е пад корань чалавека, якому сімпатызуе, якім нават захапляецца. […] Ігнатовіч шчыра перакананы, што робіць так не з карыслівых, вузкаэгаістычных меркаванняў — у імя агульнага дабра, але гэтая шчырасць якраз і робіць характар асабліва небяспечным»[3], — падкрэсліваў Б. Анашанкаў.

Крытык безумоўна меў рацыю ў тым плане, што пашырэнне такіх «кіраўнікоў новага тыпу», для якіх бюракратычныя «правілы гульні» стаяць вышэй за інтарэсы справы, утойвала вялікую пагрозу для грамадства. Магчыма, Б. Анашанкаў таму і лічыў, што, не зрабіўшы сюжэтную лінію ўзаемаадносін Сасноўскага і Ігнатовіча галоўнай у рамане, пісьменнік дапусціў відавочны промах. Дзеля вылучэння сутнаснага Б. Анашанкаў прапаноўваў адкінуць шаржыраваныя і адналінейныя, на яго думку, вобразы Дашы, Ніны Макаед, розныя «пікантныя падрабязнасці» ў рамане[4]. Але ж, заўважым, грунтоўнасць і значнасць абагульненняў, зробленых крытыкам, сведчаць хутчэй пра адваротнае — пісьменнік акрэсліў існуючую праблему дастаткова выразна. Апроч таго, пазбаўленне ад лішніх, на погляд Б. Анашанкава, сюжэтных ліній прывяло б да непаўнаты карціны рэчаіснасці і парушэння прапорцый у яе адлюстраванні. У прыватнасці, такая з'ява, як мяшчанства, відаць, шмат у чым страціла б адзнакі тыповасці і шматаблічнасці. В. Каваленка меў рацыю, называючы раман творам «пра розныя віды мяшчанства ў сучасным грамадстве і пра іх выкрыццё»[5].

Справядліва, на наш погляд, адзначыў Ю. Сураўцаў, што «...чым больш удумваешся ў расстаноўку дзейных асоб, тым больш пераконваешся ў натуральнасці і апраўданасці такой кампазіцыі шамякінскага рамана, бо тут сама задума — паказаць паўнату жыццёвай плыні, у якой «плыве», а часам і бяссільна барахтаецца галоўны герой рамана архітэктар Максім Карнач. Гэтая неаддзеленасць яго і яго таварышаў

---

[1] Цыт. паводле: Анашенков, Б. Исцелися сам…— С. 60.

[2] Тамсама.— С. 59.

[3] Тамсама.— С. 60.

[4] Гл.: тамсама.

[5] Каваленка, В. Пазіцыя пісьменніка…— С. 208.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

па прафесіі ад іншых людзей, ад жыцця горада, рэспублікі выступае тут як асаблівы **прадмет** даследавання, і таму толькі ў рэдкіх выпадках узнікае пытанне аб тым, патрэбны ці не той ці іншы персанаж (скажам, сакратарша ў гаркаме партыі, жанчына з няўдалым асабістым лёсам, Галіна Уладзіміраўна, якая закаханая, як і многія іншыя жанчыны рамана, у Максіма Карнача), той або іншы сюжэтны «ход» [...][1].

У цытаваным вышэй артыкуле  крытык звяртаў увагу на важныя аспекты канфлікту ў рамане як канфлікту не толькі вытворчага і маральнага, але разам з тым і творчага: «Калі паспрабаваць выявіць гэтыя канфліктныя вузлы (і сюжэта, і роздуму Максіма менавіта як архітэктара, творчага чалавека, і яго дыялогі-спрэчкі з сябрам і паплечнікам Віктарам Шугачовым і гэтак далей), то тут будзе, бадай, тры канфлікты, тры няпроста вырашальныя ў ходзе рэальнага жыццёвага працэсу сутыкненні, супярэчнасці:

паміж **карысцю і прыгажосцю**: «У нас усё яшчэ на першым плане эстэтыка…» – абвінавачваючы ў адносінах да Карнача і Шугачова заяўляе Макаед;

паміж **жаданым і магчымым**: бясплодная фантазія, якая хапаецца за заўтра, калі не задаволеныя патрэбы неадкладныя, пераконвае Карнача […] Ігнатовіч. З ім паступова і нялёгка рве Карнач, ірве па прычыне **творчай**, прынцыповай […].

[…] размова ідзе […] і пра складаную, неадназначна вызначаную дыялектыку нашага **сёння**, таго **мінімуму**, які цяпер нам неабходны, і нашага **заўтра**, якое падрыхтоўваецца ўжо сённяшнім максімумам патрабаванняў да сябе і іншых»[2].

Менавіта з пункту гледжання гэтай дыялектыкі сённяшняга і заўтрашняга і разглядаў Ю. Сураўцаў характар Ігнатовіча, выяўляючы ў ім тое, што засталося незаўважаным іншымі крытыкамі: «Нам цікава сачыць за тым «самарухам», які робіць у рамане Герасім Пятровіч Ігнатовіч […], чалавек валявы і, наогул, удумлівы, але занадта прывязаны, як выявілася, да клопатаў найбліжэйшай перспектывы. І гэта па-за сувяззю з перспектывай заўтрашняга жыцця, а таму па-за сувяззю з ужо і сёння заяўленымі максімальнымі чалавечымі патрабаваннямі цьмянее, губляе сваю гуманнасць і набывае рысы службісцкай, не па розуме, стараннасці. Чалавек, пераканаы ў неабходнасці новага, становіцца — нечакана для сябе і не жадаючы таго — сляпы і глухі

[1] Цыт. паводле: Суровцев. Ю. Люди искусства и науки в современном романе // Дружба народов.— 1976.— № 2.— С. 261.

[2] Тамсама.— С. 261—262.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

да новага, як толькі яно здаецца яму заўчасным. Такі чалавек «псуе жыццё» тым, каму павінны быў бы, па ідэі, дапамагаць. […]

Шамякін утрымаўся ад таго, каб павярнуць рэчышча лёсу Ігнатовіча ў бок элементарнага кар'ерызму, выслужвання і іншага, што было б саступкай схеме вобраза "адмоўнага кіраўніка"[1]».

Крытык адзначаў, што ўменне адчуць і перадаць розныя канфлікты, характэрныя для сучаснасці, дапамагала аўтару твора маляваць фігуры герояў не плоскасна, а рознабакова, у натуральнай іх супярэчлівасці, а часам — і рэальнай заблытанасці, непаслядоўнасці ўчынкаў і перажыванняў. Максім Карнач — чалавек супярэчлівы і шматгранны. Ён розны ў розных сітуацыях. Аднак, заўважым, і заўсёды роўны самому сабе. Магчыма, гэта і выпусціў з-пад увагі Ю. Сураўцаў, калі канстатаваў факт непадобнасці выкарыстання І. Шамякіным сюжэтнага ходу прыезду героя твора ў час жыццёвага крызісу ў вёску.

У літаратуры тых часоў такі сюжэтны ход сустракаўся нярэдка. Героі многіх твораў, шукаючы сэнс жыцця, «ішлі ў народ», каб «прыпасці да першакрыніц народнай мудрасці». І нярэдка ў такіх выпадках «просты люд» паказваўся ідэалізавана, «алеаграфічна», паводле выразу Ю. Сураўцава. У рамане І. Шамякіна, як адзначаў крытык, такога няма, аўтар расказвае пра сапраўдныя клопаты сяльчан[2]. Аднак крытык не растлумачыў прычыны такой з'явы. На наш погляд, яны даволі простыя.

Пры ўсім знешнім падабенстве сюжэтнага ходу з тымі, пра якія гаварылася крыху вышэй, Карнач едзе ў вёску, але, заўважым, не для пошуку сэнсу жыцця. Прычына тут куды больш празаічная — хвароба, а потым і смерць маці. Гэтыя падзеі проста супалі па часе з крызісам, падкрэслім, не ў светапоглядзе, а толькі ў жыццёвых варунках героя твора. У вёсцы воляй выпадку Карнач знайшоў тое, чаго яму ў гэты момант так неставала — канкрэтную справу, якая дасць магчымасць рэалізаваць уласныя творчыя здольнасці на карысць сабе і людзям. Праца над праектам забудовы роднай вёскі Карначу патрэбная можа нават больш, чым вяскоўцам, якія яго пра гэта папрасілі. І рэч не ў грашах, а ў нечым непамерна больш важным для творцы. Ён, як і адзначыў Ю. Сураўцаў, знаходзіць стымул для творчасці, выйсце з тупіка, у якім на нейкі момант апынуўся.

Вельмі добра, на наш погляд, сказала пра цэласнасць натуры Карнача Г. Егарэнкава: «Максім Карнач актыўны, свабодна і шыро-

---

[1] Цыт. паводле: Суровцев, Ю. Люди искусства и науки... — С. 262.

[2] Тамсама. — С. 264.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ка думаючы герой, вылучаецца зайздроснай цэласнасцю (настойваю на тым, што ёсць складанасць цэласнасці прыстойнага, незвычайнага, яркага чалавека і ёсць складанасць «раздробленасці душы», нават у подласці можна знайсці сваю складанасць, але яна складаецца відавочна з іншых інгрэдыентаў) ва ўсіх сваіх праявах — у творчых, сацыяльных, інтымных»[1].

Г. Егарэнкава адзначыла і ўменне мастака слова падкрэсліць, завастрыць прыкметы сацыяльна небяспечных з'яў. Так, гаворачы пра вобраз Макаеда, яна звярнула ўвагу на эпізод на дачы Карнача. Там Макаед двойчы спрабуе расказаць аб прачытаным ім артыкуле, у якім даводзіцца, што Сальеры не мог атруціць Моцарта: той памёр ад рэўматычнага пароку сэрца. Аднак жонка Макаеда і Карнач не слухаюць яго разважанняў ні пра Моцарта і Сальеры, ні пра складанасць сумяшчэння ў сучаснай архітэктуры функцыянальнага і эстэтычнага прызначэнняў. Яму не пярэчаць, бо ведаюць, што ніякіх довадаў ён не прыме пад увагу. І Макаед расплакаўся — яго «ніхто не любіць»[2]. «Тут Шамякін падмеціў адну вельмі важную і тыповую асаблівасць, я сказала б, «дробнага нягодніка» — неўсвядомленасць яго грамадскіх і асабістых паводзін. «Кар'ерыст», які плача,— гэта ўжо вобраз немалой абагульняючай сілы. Дробныя людзі звычайна рэдка робяць подласць свайму блізкаму свядома, для таго ў іх проста нестае інтылекту, часцей яны кіруюцца ў сваіх учынках нейкімі сваімі скажонымі, «кропкавымі» ўяўленнямі аб «праўдзе» і таму надзіва добра і зручна ўмеюць шкадаваць сябе ва ўсіх тых сітуацыях, калі раптам натыкаюцца на «неразуменне», а тым больш на адкрытае абурэнне сваіх праціўнікаў»[3],— зазначыла крытык. Яе меркаванне, што вобраз Макаеда ў рамане пазбаўлены рыс функцыянальнасці, зададзенасці не выклікае пярэчанняў.

А вось папрок пісьменніку за недастатковую глыбіню раскрыцця вобраза Ігнатовіча, на наш погляд, беспадстаўны. Як пісала Г. Егарэнкава, Ігнатовічу «ўласцівая і прыстойнасць, і глыбокі клопат пра лёс роднага горада, і нібы ўменне мысліць маштабна і перспектыўна»[4]. Толькі вось баіцца чалавек прымаць рашэнні, не апрабаваныя ў вышэйшых інстанцыях, а адкуль у яго такая хвароба — І. Шамякін не паказаў. І на пасяджэнні бюро гаркама, дзе вырашаецца лёс Карнача, мы, як сцвярджае крытык, «так і не знойдзем

[1] Цыт. паводле: Егоренкова, Г. Максим Карнач и другие // Егоренкова, Г. Звено связующее.— Минск, 1990.— С. 157.

[2] Тамсама.— С. 150.

[3] Тамсама.— С. 151.

[4] Тамсама.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

непаўторную «асобу», а толькі адміністрацыйную адзінку, якая можа павярнуць пасяджэнне ў патрэбны ёй бок»[1]. Тое адчуванне ні то нейкай страты, ні то паражэння ад невядомага праціўніка, што ўзнікае ў Ігнатовіча ў канцы пасяджэння, крытык лічыць псіхалагічна нематываваным у характары героя.

Дазволім сабе заўважыць, што пра чалавечую прыстойнасць Ігнатовіча, які так абышоўся з Карначом, гаварыць наўрад ці выпадае. У той сітуацыі Ігнатовіч такі ж «прыстойны», як і Макаед. Так, менавіта безаблічная «адміністрацыйная адзінка», магчыма, і здольная мысліць маштабна і перспектыўна, але дзейнічаць — толькі ў межах, вызначаных зверху. І добра, што Ігнатовіч хоць не страціў яшчэ здольнасці адчуваць, няхай сабе інтуітыўна, што зрабіў нешта не тое.

Урэшце, не выключана, што Г. Егарэнкава, адзначаючы непрасветленасць пісьменнікам працэсу фарміравання Ігнатовіча як бюракрата, проста хацела, каб чытач сам паразважаў над гэтай праблемай. Пра многае адкрыта сказаць было па тых часах нельга. Крытыкі мусілі лічыцца з установкамі пануючай у тыя часы ідэалогіі. Часам гэта прыводзіла і да даволі сумнеўных, з пункту гледжання сённяшняга дня, высноў. Мы маем на ўвазе стаўленне многіх крытыкаў да адлюстравання ў рамане «будуарных таямніц» герояў твора.

Аўтара рамана папракалі не за само парушэнне межаў дапушчальнага (якія ўстаяліся ў савецкай літаратуры) у адлюстраванні інтымных адносін. Больш важным было тое, што, як адзначаў Ю. Сураўцаў, жанчына выступае ў рамане ўсяго толькі ў ролі спадарожнікаў герояў-мужчын. На думку крытыка, паказ узаемаадносін мужчын і жанчын у рамане дэманструе «не ўнутрана неабходны для асобы (асобы!), а знешні, «дадатковы» сэнс гэтых узаемаадносін». А трэба было б паказваць разняволенне духоўных сіл жанчыны, рост яе творчых, грамадска-стваральных здольнасцей[2], на што нацэльвала пісьменнікаў партыя.

Менавіта таму, відаць, Ю. Сураўцаў, як і В. Шапашнікаў, Б. Анашанкаў казалі пра непатрэбнасць вобразаў Галіны Уладзіміраўны, а тым больш Ніны Макаед. Фактычна, прапаноўвалася пэўная схема адлюстравання рэчаіснасці, што выклікала пярэчанні. Так, у прыватнасці, папрокі аўтару за сцэну «падзення» Карнача з Нінай Макаед далі М. Родчанку падставу для даволі з'едлівага пытання: «А як жа быць тады з адпаведнай сцэнай «падзення» Давыдава перад Лушкай Нагульнавай з «Узнятай цаліны» Шолахава? І ці не раіць крытык шамякінскім героям паводзіць сябе згодна з ім жа самім

[1] Цыт. паводле: Егоренкова, Г. Максим Карнач…— С. 151.
[2] Цыт. паводле: Суровцев, Ю. Люди искусства…— С. 264.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

вынайдзеным «прыёмам»: ідзі прэч ад мяне, я «станоўчы», а ты “адмоўная”»[1].

Уплыў на выказванні крытыкаў ідэалагічных установак, згодна з якімі асновай сям'і з'яўляецца не толькі каханне, але і агульнасць сацыяльнай пазіцыі мужа і жонкі, адчуваецца даволі выразна і ў іншых момантах. Так, той жа Ю. Сураўцаў пісаў: «Але вось чым пісьменнік нанёс урон характару Ігнатовіча, дык гэта ўздзеянне на героя мяшчанкі-жонкі і мяшчанкі яе сястры (жонкі Карнача). Наогул мяшчанкі-жонкі адказных і творчых работнікаў нешта залішне часта прапісваюцца ў нашай прозе, а між тым жонка характарызуе і мужа, і калі вы пераконваеце нас у тым, што ваш герой — чалавек творча значны, а сяброўка яго жыцця недалёкая, карыслівая, пашлаватая і гэтак далей, і да таго падобнае, то… вы, пісьменнік, моцна б'яце па маім чытацкім даверы да таго, што герой вамі ўзвышаны па праве»[2]. А Г. Егарэнкава выказвала сумненне ў тым, што Ігнатовіч, як «муж сваёй жонкі», мяшчанкі, мае маральнае права быць буйным кіраўніком, вырашаць лёс людзей. Бо, на яе погляд, кампрамісы ў каханні раз'ядаюць маральныя асновы і становяцца сацыяльна небяспечнымі[3].

Што ж, з такімі высновамі можна было б пагадзіцца, калі б «муж сваёй жонкі» да сустрэчы з ёй быў абсалютна беззаганным чалавекам. Але ці быў ён такі? Па-другое, каханне — пачуццё ірацыянальнае, ад розуму не залежыць і яму не падпарадкуецца. Нарэшце, зносіны людзей, нават не надта блізкіх, не абыходзяцца без пэўных кампрамісаў і ўзаемных уплываў. Але характар і ступень іх могуць быць вельмі рознымі. Ёсць пэўныя межы для кампрамісаў, і не кожны паддаецца ўплыву, яскравы прыкладу чаго — гісторыя краху сям'і Карнача. Урэшце, і самі крытыкі ў нечым супярэчылі сабе, калі адзначалі, што Ігнатовіч «занадта буйны для таго, каб стаць неразважаючай прыладай помсты ў руках дзвюх дурнаватых бабёнак, якія пажадалі пакараць Максіма Карнача»[4], «не сколак, не падабенства сваёй жонкі»[5]. Ігнатовіч дзейнічае не па ўказцы жонкі, а ў адпаведнасці з уласным характарам і разуменнем сітуацыі. Увогуле ж, як слушна, на наш погляд, сцвярджаў М. Родчанка, «сямейна-бытавыя калізіі распрацаваны ў «Атлантах і карыятыдах» надзвычай праўдзіва, па-мастацку выразна і паслядоўна»[6].

---

[1] Родчанка, М. Маральна-этычная праблематыка…— С. 118.
[2] Цыт. паводле: Суровцев, Ю. Люди искусства…— С. 262.
[3] Гл.: Егоренкова, Г. Максим Карнач…— С. 161—162.
[4] Цыт. паводле: Суровцев, Ю. Люди искусства…— С. 262.
[5] Цыт. паводле: Егоренкова, Г. Максим Карнач…— С. 163.
[6] Родчанка, М. Маральна-этычная праблематыка…— С. 118.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Пэўныя адрозненні ў ацэнцы ўсялякага твора непазбежныя. Яны вынікаюць і з суб'ектыўнасці ўспрымання матэрыялу крытыкамі, і з прынцыповай немагчымасці вычарпальна вытлумачыць мастацкі вобраз. Як зазначаў М. Родчанка, толькі за чатыры гады пасля выхаду «Атлантаў і карыятыдаў» у свет, у рэспубліканскай і саюзнай перыёдыцы з'явілася больш за два дзясяткі рэцэнзій, водгукаў, асобных ацэнак у аглядах: «Звяртае на сябе ўвагу тое, што погляды многіх крытыкаў, рэцэнзентаў, адзіных у ацэнцы актуальнасці і важнасці пастаўленых у рамане праблем, нярэдка разыходзяцца, як толькі гаворка заходзіць аб асаблівасцях і глыбіні мастацкага ўвасаблення аўтарскай задумы, пераканальнасці тых або іншых вобразаў, сюжэтных сітуацый і г. д. Справа даходзіць да існавання дыяметральна процілеглых ацэнак, нават кур'ёзаў і парадоксаў…»[1]. Зазначым, аднак, што гэтая акалічнасць шмат у чым спрыяла набліжэнню да ісціны. На наш погляд, найбольш грунтоўна і аб'ектыўна на сённяшні дзень твор разгледзены ў манаграфіі В. Каваленкі «Іван Шамякін: нарыс жыцця і творчасці»[2].

Папулярнасць твора была настолькі вялікай, што ўзнікла ідэя яго экранізацыі. І ў 1980 годзе адбылася прэм'ера аднайменнага чатырохсерыйнага тэлевізійнага фільма. Ён спадабаўся гледачам, і праз год ці паўтара пасля яго выхаду на экраны ў Міністэрстве культуры СССР адбылася цікавая гутарка, сведкам якой стаў І. Міхайлаў. Размова ішла пра стварэнне працягу тэлефільма (а значыць, па сутнасці, і самога рамана)[3].

Ці вядома было пра такі намер «вярхоў» самому аўтару «Атлантаў і карыятыдаў», І. Міхайлаў пэўна сказаць не браўся. Але ён засведчыў, што кінарэжысёр Ю. Вышынскі агучыў меркаваны сюжэт працягу фільма. Згодна з ім, у далейшым Сасноўскі пераводзіцца ў Мінск, бо абраны першым сакратаром сталічнага абкама, потым прызначаецца намеснікам Старшыні Савета Міністраў БССР, а праз пэўны час — загадчыкам аддзела ЦК КПСС па сельскай гаспадарцы і пераязджае ў Маскву.

Ігнатовіч таксама ўздымаецца па кар'ернай лесвіцы — становіцца першым сакратаром абкама партыі, потым — кандыдатам у члены

---

[1] Родчанка, М. Маральна-этычная праблематыка…— С. 114.

[2] Гл.: Каваленка, В. На кім трымаецца скляпенне свету? / Каваленка, В. Іван Шамякін: нарыс жыцця і творчасці.— Мінск, 1980.— С. 169—177.

[3] Гл.: Міхайлаў, І. Карнач павінен быў развесціся з Адаркай… і ажаніцца зноў // ЛіМ.— 2004.— 9 студз.— С. 13.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Бюро ЦК КПБ, і нарэшце — сакратаром ЦК КПБ па сельскай гаспадарцы.

Максім Карнач разводзіцца з жонкай, атрымлівае пасаду міністра будаўніцтва і архітэктуры і прапануе руку і сэрца Галіне Уладзіміраўне. Віктара Шугачова ён пасля доўгіх угавораў прызначае начальнікам аднаго з аддзелаў абласнога ўпраўлення архітэктуры. А яго сыну дапамагае стаць галоўным архітэктарам горада, зрабіўшы ўсё магчымае, каб гэтую пасаду не заняў Макаед.

Макаед мусіў задаволіцца пасадай загадчыка кафедры інстытута, якую раней займала яго жонка. А тая скочыла ў крэсла аднаго з намеснікаў галоўнага архітэктара горада, што выклікала чарговае высвятленне асабістых адносін[1].

Як зазначаў І. Міхайлаў, ідэя сцэнарыя «была падтрыманая на калегіі Міністэрства культуры СССР, але яе «зарубілі» ў аддзеле агітацыі і прапаганды»[2]. Задума так і засталася нявдзейсненай. Аднак сам факт яе ўзнікнення сведчыў, што і праз дзесяцігоддзе пасля выхаду ў свет раман не страціў актуальнасці і папулярнасці.

Даўно мінулі адлюстраваныя ў «Атлантах і карыятыдах» часы. Змянілася жыццё, шмат у чым змянілася і грамадства. Але раман не забылі, яго чытае і старэйшае пакаленне, і моладзь. Сведчанне таму — перавыданні твора ў 2004-м і 2008 гадах. І мерапрыемствы з нагоды 30-годдзя выхаду ў свет «Атлантаў і карыятыдаў», праведзеныя ў 2004 годзе па ініцыятыве Саюза беларускіх архітэктараў і іншых грамадскіх арганізацый. І конкурс на найлепшую ілюстрацыю да рамана сярод студэнтаў мастацкіх ВНУ краіны, які адбыўся ў межах гэтай акцыі.

Думаецца, што раман «Атланты і карыятыды», як і многія іншыя творы І. Шамякіна, не страціць прывабнасці для чытача і ў будучыні. Бо, як бы ні змяняліся абставіны жыцця, людзей ніколі не пакіне мара пра сцвярджэнне ў жыцці гуманістычных ідэалаў і сапраўдных, а не фальшывых духоўных каштоўнасцей. Не знікне і патрэба глыбей пазнаць жыццё, зразумець людзей і самога сябе. А ў гэтай справе якасная мастацкая літаратура заўсёды была і будзе найлепшым памочнікам.

*Мікалай Караткоў*

[1] Гл.: Міхайлаў, І. Карнач павінен быў развесціся...— С. 13.

[2] Тамсама.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова